ЗАСТАЛОСЯ 10 РАШАЮЧЫХ ДЗЕН

50,5 ПРОЦ. ПАСЕВА У ІЛЬНУ ВЫЦЕРАБЛЕНА

Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі

Год выданьня—XV
№ 230 (4135)
АЎТОРАК 25 жніўня 1931 г.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА.

Лён толькі тады можна лічыць убраным, калі ён будзе абмалочан, разаслан, або закладзен у мачыльныя ямы, зьвезен у мяльна-сушыльныя пункты і на ільназаводы

НКЗБ І КАЛГАСЦЭНТР—АД ВАС ЗАЛЕЖЫЦЬ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ МЯЛЬНА-СУШЫЛЬНЫХ ПУНКТАЎ АПАЛАМІ

Загатоўкі—на поўны ход!

Посьпех усёй асеньняй сельскагаспадарчай кампаніі ў вялікай ступені вызначаецца баявым правядзеньнем загатовак.

Загатоўчая работа завяршае працэс барацьбы за другі бальшавіцкі ўраджай, за стварэньне магутнай сыр'цовай базы для сацыялістычнай прамысловасьці. **Загатоўкі — адзін з рашаючых вучасткаў клясавай барацьбы ў вёсцы,** асказьнейшы момант у рабоце партыйных і савецкіх арганізацый па яшчэ большым згуртаваньні калгасных і бядняцка-серадняцкіх аднаасобных мас на барацьбу з кулаком, на барацьбу за далейшую сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі.

Умовы для загатоўчай кампаніі ў гэтым годзе значна **палепшыліся,** дзякуючы моцнаму росту аграмаджанага сэктару. Між тым, ход загатовак трэба прызнаць **ЯЎНА НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫМ.** За 10 жніўня загатоўлена: збожжа 13,6 проц. жнівеньскага пляну, сена — 17,9 проц. гадавога пляну, раньняй бульбы — 28,4 проц.

Дзе трэба шукаць прычыны прарываў у загатоўчай рабоце?

Карэньні гэтых прарываў хаваюцца **У АПАРТУНІСТЫЧНЫМ САМАЦЁКУ,** які нараждаецца разьлікамі на стыхійны прыток хлеба і іншых відаў прадукцыі, паколькі, моў, калгасы і саўгасы займаюць усё большую і большую долю ў загатоўчых плянах.

Падобнага роду разважаньні зьяўляюцца горшым відам апартунізму, праяўленьнем палітычнай сьлепаты, неразуменьнем таго, што фронт загатовак — фронт клясавай барацьбы. Загатоўкі трэба **АРГАНІЗАВАЦЬ,** ператварыць іх у шырокую **масавую** гаспадарча - палітычную кампанію, якая-б праводзілася на аснове **САЦСПАБОРНІЦТВА** паміж саўгасамі, калгасамі, вёскамі, сельсаветамі і раёнамі.

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б у сваёй пастанове, апублікаванай заўчора ў «Зьвязьдзе», канстатаваў, што **загатоўчая кампанія «застала партыйныя і савецкія арганізацыі, а таксама загатоўчы апарат зусім непадрыхтаваным»** і што **«загатоўкі фактычна прадастаўлены апартуністычнаму самацёку».**

Гэта ўказаньне Цэнтральнага Камітэту абавязвае ўсе партыйныя, савецкія і грамадзкія арганізацыі як у цэнтры, так і на мясцох неадкладна перабудаваць і крута ўзьняць уверх крывую загатовак.

Трэба абвясьціць бязьлітасную барацьбу самацёку ў загатоўчай кампаніі, спробам правесьці яе бюракратычным шляхам, бяз удзелу мас.

Значэньне надзвычайнай важнасьці набывае пытаньне неадкладнага ўкамплектаваньня **ЗАГАТОЎЧАГА АПАРАТУ** зьверху да нізу, рашучага ўмацаваньня яго кваліфікаванымі, палітычна вытрыманымі кадрамі. Трэба рашуча пакласьці канец самавольным перакідкам райспабаў, выкарыстаньню іх не па прызначэньні. **СЫСТЭМА ЗАРПЛАТЫ** работнікаў загатоўчага апарату павінна быць перабудавана на аснове **зьдзельшчыны і ўкараненьня заахвочальнай сыстэмы.**

Посьпех загатовак у значнай ступені вырашае выразная, бесьперабойная работа **ПРЫЁМАЧНЫХ ПУНКТАЎ,** самая рашучая барацьба з чаргамі, поўнае абслугоўваньне здатчыкаў. Абураючыя адносіны і нават адмаўленьні ад прыёму прадукцыі з боку загатоўчых органаў, якія мелі месца ў Віцебску, Гарадку, Менску і інш. мясцох, трэба выпальваць гарачым жалезам. Лёзунг **здачы хлеба з пад малатарні на загатоўчыя пункты,** павінен быць перавторан у жыцьцё.

НЕАДЛУЧНАЙ І ВАЖНЕЙШАЙ ЧАСТКАЙ ЗАГАТОЎЧАЙ КАМПАНІІ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА РЭАЛІЗАЦЫЯ КАНТРАКТАЦЫЙНЫХ ДАГАВАРОЎ.

Кантрактацыя аказвае вялікую дапамогу **сацыялістычнаму будаўніцтву,** забясьпечваючы прамысловасьць сельска-гаспадарчым сырцом і ўкараняючы плянавасьць у сельскую гаспадарку.

Аднак, кантрактуючыя арганізацыі, і ў першую чаргу Наркамснаб не забясьпечылі належнага выкананьня дагавароў. Больш таго, у радзе месц сустракаецца скажэньне разуменьня ролі гэтых дагавароў, разважаньні аб тым, што ў сувязі з разьвіцьцём калгаснага будаўніцтва кантрактацыя, быццам, ужо згубіла сваё значэньне.

Падобнага роду «тэорыі» зьяўляюцца яркім праяўленьнем ігнараваньня ролі аднаасобнага сэктару ў выкананьні плянаў загатовак і незразуменьня таго, што кантрактацыйныя дагавары **ахапляюць** ня толькі бядняцка-серадняцкую частку аднаасобнікаў, але і калгасы. Іменна ў гэтай блытаніне трэба шукаць тлумачэньнаў таму становішчу, што на 15 жніўня рэалізавана толькі 3 проц. пляну збожжазагатовак у частцы кантрактацыі.

Трэба шырока разгарнуць арганізацыйна-масавую работу вакол рэалізацыі кантрактацыйных дагавароў, неадкладна скончыць запаўненьне і выдачу на рукі кантрактацыйных сьпісаў.

Разгортваючы растлумачальную работу, сацспаборніцтва і ўдарніцтва сярод калгасаў і бядняцка-серадняцкай часткі аднаасобнікаў, партарганізацыі павінны адначасова паставіць пад пільны кантроль давядзеньне цьвёрдых заданьняў і іх **ВЫКАНАНЬНЕ** кулацка-заможнымі гаспадаркамі, рашуча змагаючыся з фактамі апартуністычнай практыкі ў гэтай галіне. Хлеб і іншыя віды прадукцыі, вызначаныя ў парадку цьвёрдых заданьняў, павінны быць спагнаны ў тэрмін і поўнасьцю.

Асабліваясьць загатоўчай кампаніі гэтага году заключаецца ў тым, што, на аснове росту пасеўных плошчаў і поўнай зьмены структуры сельскай гаспадаркі ў сувязі з яе спэцыялізацыяй, загатоўкі зьмяняюцца ня толькі з боку павялічэньня колькаснага аб'ёму, але і па характары саміх аб'ектаў.

Важнейшае месца ў загатоўчых плянах набываюць **ТЭХКУЛЬТУРЫ, ПЛОДАГАРОДНІНА** і прадукты **ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ.** Гэта абавязвае партыйныя і загатоўчыя арганізацыі неадкладна праверыць яшчэ раз свае гатоўнасьць да правядзеньня гэтага віду загатовак, забясьпечыць іх бальшавіцкае правядзеньне. Аднэй з умоў пасьляховага выкананьня загатовак зьяўляецца своячасовы завоз **ПРАМТАВАРАЎ** у раёны асноўных загатовак, правільнае скарыстаньне прамтаварных рэсурсаў, як магутнага стымулу здачы таварнай сельгаспрадукцыі дзяржаве.

Мы ўступілі ў адказьнейшую паласу загатоўчай кампаніі. Вайна самацёку! Раўнаньне на перадавікоў, якія выконваюць свае пляны. (Чырвона-Слабодзкі, Бягомльскі і інш. раёны).

Барацьбой за скарочаньня тэрміну загатовак, мабілізацыяй працоўных мас вакол лёзунгу—ні аднаго цэнтнэра хлеба на прыватны рынак—бязьлітаснай барацьбой з правапартуністычнымі скажэньнямі лініі партыі ў загатоўчай рабоце, барацьбой з «лявацкімі» загібамі,—мы забясьпечым поўнае выкананьне загатовак,—гэтага важнейшага зьвяна завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

НЕАДКЛАДНА АРГАНІЗАВАЦЬ ДАПАМОГУ ІЛЬНАВОДЧЫМ РАЁНАМ

Апошняя пяцідзёўка ў ходзе ўборкі ільну дала значны зрух. Калі на 15 жніўня было ўбрана 27,4 проц., дык на 20 жніўня ўбрана 50,5 проц., Мы ўступілі ў рашаючыя дні ўборкі. Рад ужо раёнаў скончылі цераблельне: Буда-Кашалёўскі, Каралінскі, Чачэрскі, у некаторых уборка канчаецца.

Аднак, нельга прайсьці міма таго факту, што рад рашаючых паўночных ільнаводчых раёнаў ганебна адстаюць. Так, Бешанковіцкі ўбраў 7,5 проц. пляну, Віцебскі — 16,6 проц., Дрысенскі — 13,1 проц., Полацкі — 10,4 проц., Расонскі—33 проц. і інш. Рад цэнтральных раёнаў праводзяць уборку яшчэ горш. Так, Смалявіцкі ўбраў 1,3 проц., Плешчаніцкі—3,9 проц., Менскі — 13,9 проц., Лагойскі—2,9 проц., Бягомльскі— 1,5 проц. і г. д.

Адставаньне рашаючых ільнаводчых раёнаў выклікае сур'ёзную трывогу за пасьляховае правядзеньне ўборкі і апрацоўкі ільну. Гэтым раёнам неадкладна трэба аказаць дапамогу. Трэба пакласьці канец ігнараваньню дырэктыў Калгасцэнтру з боку некаторых раёнаў, якія ня выконваюць заданьняў па пасылцы калгасьнікаў у дапамогу ільнаводчым раёнам (Быхаў, Бягомль). Ільнаводчыя раёны павінны ў бліжэйшыя дні мабілізаваць усю рабочую сілу на ўборку ільну, увесьці ва ўсіх калгасах зьдзельшчыну, ліквідаваць нядбайныя адносіны да ільнаўборачных машын і поўнасьцю скарыстаць усе ільнацерабілкі.

Уборка і апрацоўка ільну павінны праходзіць неадлучна адна ад другой. Убраны лён павінен быць зараз-жа абмалочан, разаслан або закладзен у мачыльныя ямы. Адкладваньне гэтай работы можа прывесьці да таго, што мы маем у тых калгасах, дзе адкапалі звозку хлеба з поля,—у выніку хлоб на полі пачаў псавацца і прарастаць. УБОРКУ ІЛЬНУ МОЖНА ЛІЧЫЦЬ СКОНЧАНАЙ ТОЛЬКІ ТАДЫ, КАЛІ ЛЁН БУДЗЕ АБМАЛОЧАН, РАЗАСЛАН, ЗАМОЧАН І ЗЬВЕЗЕН У СУШНІ, АБО ЗДАН НА ІЛЬНАЗАВОДЫ. Адначасова трэба рашуча змагацца з нядбайнымі адносінамі да апрацоўкі ільну. Мы ўжо маем прявы гэтага ў некаторых раёнах. Так, у Вушацкім раёне калгас «Чырвоны кастрычнік» замочыў лён, не абмалаціўшы яго. З такога роду прявамі кулацкага шкодніцтва і стратамі пры ўборцы і апрацоўцы ільну трэба весьці самую рашучую барацьбу.

Пасьля абмалоту, спаньня і мочкі наступае вельмі адказны перыяд, па АПРАЦОЎЦЫ ІЛЬНУ НА МЯЛЬНА-СУШЫЛЬНЫХ ПУНКТАХ. Між тым гэты адказьнейшы этап натыкаецца на цэлы рад бюракратычных і апартуністычных адносін да будаўніцтва мяльна-сушыльных пунктаў і загатоўкі для іх апалу. Паводле апошніх даных, пабудова мяльна-сушыльных пунктаў выканана на 42 проц. А аб ходзе загатоўкі апалу нават цэнтральныя арганізацыі як Наркамзем і Калгасцэнтр нічога ня ведаюць. Усе гэтыя самацёчныя настроі ў справе падрыхтоўкі да апрацоўкі ільну, павінны атрымаць самы рашучы ўдар.

Посьпех уборкі і апрацоўкі ільну можа быць дасягнут толькі тады, калі ва ўсіх калгасах будзе правільна арганізавана праца на аснове зьдзельшчыны. Сёньня мы павінны канстатаваць, што АДСУТНАСЬЦЬ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ І ПРАВІЛЬНАГА ЎЛІКУ ПРАЦЫ Ў ЗНАЧНАЙ ЧАСТЦЫ КАЛГАСАЎ, ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА АСНОЎНАЙ ПРЫЧЫНАЙ МАРУДНЫХ ТЭМПАЎ УБОРКІ ЯРАВЫХ. На 20 жніўня яравых убрана толькі 39,7 проц. Гэта зацяжка з уборкай яравых затрымлівае ўборку тэхкультур, пагражае затрымаць уборку бульбы і выкананьне пляну па закладцы сілазу.

Таму падрыхтоўка да апрацоўкі ільну і правядзеньне чарговых гаспадарча-палітычных кампаній ПАВІННА СУПРАВАДЖАЦЦА НАПРУЖАНАЙ РАБОТАЙ ПА ПЕРАВОДЗЕ КАЛГАСАЎ НА ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ І НАЛАДЖВАНЬНІ ДАКЛАДНАГА ЎЛІКУ ПРАЦЫ КОЖНАГА КАЛГАСЬНІКА. Нацярпіма такое становішча, калі і на сёньнішні дзень з 9.532 калгасаў толькі 5.018 калгасаў вядуць рэгулярны запіс працэдзён. У астатніх-жа фактычна працьвітае падзёншчына і як вынік—ураўнілаўка. Падзёншчына і ўраўнілаўка зьніжаюць тэмпы ўборачнай, вядуць да заняпаду калгасаў і граюць на руку клясаваму ворагу.

Ліквідацыя паказаных недахопаў на фронце ўборачнай і поўны перавод усіх калгасаў на зьдзельшчыну — ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА НЕАБХОДНАЙ УМОВАЙ ДЛЯ АРГАНІЗАЦЫЙНА - ГАСПАДАРЧАГА ЗАМАЦАВАНЬНЯ КАЛГАСАЎ І ДАЛЕЙШАГА РАЗГОРТВАНЬНЯ КАЛГАСНАГА РУХУ.

ЗБОДКА

аб пераводзе калгасаў на зьдзельшчыну, ходзе ўборкі ільну, яравых і сіласным будаўніцтве і сіласаваньні

па становішчы на 20 жніўня 1931 году.

Назва раёнаў.	Лік калгасаў.	Перайшоўш. на зьдзельшчыну.	Забясьпеч. прац. кніжк.	Праз. запіс. у кніжках.	Убрана ільну у процентах	Уборка яравых збожжавых у проц.	Будаўніцтва сілосных ям і траншэй у проц.	Сілосавана ў проц.
Лік калгасаў								
ПАЎДНЁВЫЯ								
1. Брагінскі	86	81	84	81	99,7	59,1	0,1	2,0
2. Буда-Кашалёўскі	45	45	38	30	100,0	85,6	2,5	6,7
3. Вабруйскі	132	90	121	75	76,7	73,4	9,6	4,0
4. Ветка́ўскі	70	65	62	55	92,7	88,6	11,8	4,0
5. Гацкі	117	82	75	75	70,1	71,0	21,0	7,4
6. Гомельскі	52	50	40	40	53,0	71,3	13,5	2,6
7. Жыткавіцкі	62	62	55	52	42,0	23,8	13,7	0,3
8. Жлобінскі	103	62	73	62	95,5	64,6	11,2	2,9
9. Кармянскі	136	103	112	103	83,8	57,9	15,0	2,8
10. Камарынскі	36	36	36	36	81,0	24,4	25,8	28,6
11. Каралінскі	76	70	70	42	100,0	68,3	26,8	7,0
12. Лоеўскі	82	76	82	72	40,9	—	17,2	3,4
13. Любаньскі	45	42	38	—	85,0	67,1	26,8	3,0
14. Лельчыцкі	47	40	35	25	91,0	41,6	11,6	5,2
15. Мазырскі	141	70	97	—	92,4	56,1	—	2,6
16. Нараўлянскі	67	50	32	26	57,8	38,6	3,6	0,1
17. Парыцкі	99	49	28	12	68,2	92,3	—	—
18. Пятрыкоўскі	95	63	62	47	—	25,9	12,8	0,3
19. Рагачоўскі	130	109	104	104	87,9	80,4	21,5	2,8
20. Рэчыцкі	117	75	70	40	98,1	79,8	17,3	—
21. Слуцкі	160	138	138	138	56,8	69,5	5,2	2,8
22. Старобінскі	61	63	58	—	85,8	62,0	—	—
23. Стародароскі	69	64	62	62	62,0	51,1	11,8	1,5
24. Тураўскі	33	29	31	—	40,3	40,5	18,3	22,6
25. Цераха́ўскі	67	62	45	41	82,5	51,6	12,0	25,2
26. Чачэрскі	44	43	43	43	100,0	28,4	28,9	17,5
27. Чырвонапольскі.	107	94	43	12	88,9	83,4	18,7	12,3
28. Чырвона-Слабодзкі	42	35	33	30	49,6	46,0	27,5	0,8
29. Уваравіцкі	41	31	35	11	83,2	72,5	20,7	1,5
30. Хойніцкі	82	76	80	68	93,9	48,2	5,3	10,2
ЦЭНТРАЛЬНЫЯ								
31. Асіпавіцкі	115	99	105	99	68,3	70,3	12,5	2,6
32. Быхаўскі	163	109	105	75	57,6	—	15,8	0,7
33. Барысаўскі	136	95	100	73	23,4	4,7	12,6	1,3
34. Бялыніцкі	147	140	112	112	62,1	29,4	24,7	—
35. Бягомльскі	138	86	85	82	1,5	16,5	25,9	6,7
36. Барэзінскі	106	70	89	70	93,7	66,3	44,2	0,5
37. Горацкі	208	196	178	176	35,5	21,2	19,1	11,2
38. Заслаўскі	44	42	42	38	17,2	24,3	21,4	2,4
39. Клімавіцкі	105	87	—	—	47,2	31,0	27,2	20,7
40. Крупскі	202	120	119	116	21,7	19,6	21,5	0,6
41. Капыльскі	157	142	138	130	10,9	65,5	10,9	3,0
42. Касьцюковіцкі	266	219	241	219	51,8	41,2	12,1	2,7
43. Клічаўскі	114	102	80	44	29,1	13,2	11,0	0,2
44. Койданаўскі	115	114	112	112	22,0	51,1	58,1	7,8
45. Крычаўскі	93	89	88	83	36,5	45,6	19,4	4,6
46. Лагойскі	97	48	75	53	2,9	17,7	17,8	5,0
47. Магілёўскі	162	139	140	—	68,1	35,5	15,2	0,6
48. Мсьціслаўскі	202	195	187	187	31,3	24,4	22,3	19,1
49. Менскі	125	83	83	—	13,9	21,3	17,7	6,0
50. Прапойскі	99	86	50	40	83,8	51,4	20,4	0,6
51. Пухавіцкі	142	138	138	92	61,5	54,2	7,5	1,5
52. Плешчаніцкі	86	85	76	76	3,9	19,5	9,1	—
53. Смалявіцкі	101	80	101	101	1,3	49,8	31,7	6,7
54. Талачынскі	307	233	98	45	47,2	19,2	35,8	6,9
55. Чэрвенскі	80	60	78	60	77,3	43,7	14,6	2,0
56. Чавускі	195	154	107	82	78,5	48,8	13,0	1,6
57. Чэрыкаўскі	114	90	—	—	51,3	38,2	20,5	2,2
58. Шклоўскі	178	173	116	116	74,5	23,0	27,4	3,9
59. Вузьдзенскі	75	69	68	55	70,8	61,4	15,9	—
ПАЎНОЧНЫЯ								
60. Асьвейскі	62	62	21	7	—	2,3	10,9	2,2
61. Аршанскі	332	245	245	245	55,2	16,5	8,9	5,4
62. Бешанковіцкі	220	117	70	25	7,5	17,2	7,2	2,5
63. Віцебскі	140	138	103	97	16,6	34,4	—	12,5
64. Вушацкі	208	196	178	176	67,3	25,0	15,3	5,9
65. Гарадоцкі	371	199	—	—	49,8	39,0	2,3	3,6
66. Дубровенскі	175	135	—	—	44,6	38,5	48,2	3,7
67. Дрысенскі	176	96	89	89	13,1	2,0	15,9	11,9
68. Лёзьнянскі	202	125	176	125	40,8	15,2	14,7	3,1
69. Лепельскі	129	128	129	125	52,4	2,2	31,9	6,0
70. Полацкі	224	142	90	—	10,4	10,9	20,0	8,5
71. Расонскі	78	70	74	56	33,0	10,4	—	3,0
72. Суракскі	163	112	94	87	50,8	66,2	0,3	8,5
73. Сеньненскі	261	226	190	170	38,4	25,2	32,1	6,7
74. Сіроцінскі	224	204	219	—	42,0	34,1	35,3	28,1
75. Чашніцкі	191	140	190	107	47,9	13,3	23,7	2,0
Усяго па БССР.	9.582	7.522	6.641	5.018	50,5	39,7	16,1	3,9

Увага: 1. Раёны: Крупскі, Лёзьнянскі, Барысаўскі, Лоеўскі, Пятрыкоўскі, Жыткавіцкі на 20 жніўня зводак ня прыслалі.

2. Раёны: Цераха́ўскі, Крычаўскі, Асьвейскі не далі паказальнікаў аб уборцы ільну.

3. Па раёнах: Дубровенскім уключаны весткі аб ходзе калектывізацыі па становішчы на 30 ліпеня 1931 г., Барысаўскім—на 10 ліпеня, Лельчыцкім—20 ліпеня, Жыткавіцкім—20 ліпеня, Крычаўскім—10 жніўня, Лоеўскім—10 жніўня, Нараўлянскім—10 жніўня, Пятрыкоўскім—10 ліпеня, Крупскім—15 ліпеня, Лёзьнянскім—15 жніўня.

Член калегіі НКЗБ СЬ

3400 мяльна-сушыльных пунктаў пабудавана толькі 170

Загатоўкамі апалу ніхто не займаецца

У БССР павінна быць арганізавана 400 мяльна-сушыльных пунктаў для сушкі і апрацоўкі ільну. Мы ўжо сыгналізавалі аб тым, што арганізацыя іх ідзе надзвычай марудна. Між тым, гэтая ўлічана і справа з арганізацыяй мяльна-сушыльных пунктаў на сёньнішні дзень знаходзіцца ў галебным становішчы.

Паводле вестак Калгасцэнтру, арганізавана 170 мяльна-сушыльных пунктаў. Астатнія 230 пунктаў Калгасцэнтр мяркуе, што будуць арганізаваны ў бліжэйшы час. Калгасцэнтр з арганізацыяй пунктаў таксама не сьпяшаецца, з та прычыны, што да 1 кастрычніка ў БССР будзе завезена толькі 175 ільна-мяльных машын.

Як ідзе загатоўка апалу для мяльна-сушыльных пунктаў, аб гэтым ніхто ня ведае. Работнік сэктару тэхкультур Калгасцэнтру кажа, што спусьцілі пляны загатовак у раёны і Лесбел разаслаў нарады на дровы ў леспрамгасы. Але з некаторых месц ёсьць тэлеграмы, дзе райкалгассаюзы пішуць, што да гэтага часу не атрымалі дроў. Так, Лёзьнянскі райкалгассаюз піша Калгасцэнтру аб тым, што леспрамгас не атрымаў ад Лесбелу нараду на гэтыя дровы і таму не выдае іх.

Трэба ў бліжэйшыя дні арганізаваць мяльна-сушыльныя пункты. Трэба пераверыць хто затрымлівае адсылку нарадаў на дровы Лёзьнянскаму леспрамгасу і прыцягнуць да адказнасьці.

Б. Х.

Аздаравіць кіраўніцтва калгасу „Зьвязда“

БЕШАНКОВІЧЫ. Калгас «Зьвязда» Бешанковіцкага раёну, ня раз фігураваў на старонках нашай газэты, як прыкладны калгас. Ён першы на Вулічыне зьвінчыў абязьлічку і ўвёў зьдзельшчыну, па-базовому правёў палітпадрыхтоўку да веснавой сяўбы, перавыканаўшы пляны. Шмат іншых дасягненьняў мае калгас. Першы ішоў ідзе ва ўборачнай кампаніі, 45 га жыта зжата за 4 дні. Убраны з поля ячмень, гарох, піка на корм. Сенажаць уся ўбрана даўно. Калгасьнікі заяўляюць: «Сёлета корму на 4 такіх калгасы». Сілосныя таксама закладзены. Уборка ільну на выходзіць да канца.

Зразумела, гэтых посьпехаў калгас дабіўся ў выніку добрай арганізацыі працы яшчэ з часу падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі, калі старшынёй калгасу зьяўляўся адзін з лепшых старшынь калгасаў былога Вульскага раёну, тав. Найдукоў.

Зараз кіраўніцтва калгасам знаходзіцца ў ненадзейных руках. Старшыня калгасу Рычка знаходзіцца пад уплывам рахункавода Камовіча Цімоха — былога афіцэра — і Цецерава Івана. Вось гэтая тройка — галоўка калгаса — займаецца сыстэматычнай палітыкай, якая вядзе калгас да разбурэньня.

Камовіч задае тон у калгасе. Ён вінаваціць за тое, што сьвіней трымаць не трэба («Зьвязда» — сьвінагадоўчая фэрма), што іх трэба раздаць малым калгасам.

Так і робяць: ужо раздалі 40 парасят розным асобам, нават не калгасьнікам.

Пры такім «кіраўніцтве» ёсьць пагроза заняпаду працоўнай дысцыпліны, бо ўлік працы ў руках афіцэра Камовіча яўна скажаецца. Напрыклад, сабе піша па 2-2,25 працадні ў той час, калі працуе мала. Ёсьць выпадкі, калі працадні выдаюцца не ў залежнасьці ад працадзён.

Калгас «Зьвязда» здаровы, толькі трэба аздаравіць кіраўніцтва, жорстка ўдарыўшы на Цецеравых і Камовічах, зваядлых п'яніцах, вырваўшы з пад іх уплыву тав. Рычка.

А. М.

Новаўступіўшыя калгасьнікі—за абагульваньне пасеваў ільну

Крупскі райкалгассаюз супроць

КРУПКІ. (Наш. кар.). Тэмпы ўборкі ільну ў Крупскім раёне не здавальняючыя. На 20 жніўня ўбрана 1763 гэкт ільну, што складае 29,56 проц. Замоча на ўжо 254 тоны і разаслана 483 тоны ільну. Убраны лён не залежваецца, а ідзе ў далейшую перапрацоўку.

Для пасьпяховага ходу ўборкі ільну патрэбна штодзённае апэрацыйнае кіраўніцтва работай калгасаў з боку райкалгассаюзу і сельсаветаў, але на справе гэтага няма.

У апошні час у раёне наглядаецца новы прыліў у калгасы. Калі на 10 жніўня было калектывізавана 38,6 процант бядняцка - серадняцкіх гаспадарак, дык на 20 жніўня — калектывізавана 43,16 проц. Адсюль задача—дабіцца, каб новаўступаючыя ў калгасы бядняцка-серадняцкія гаспадаркі абагулілі свае пасевы і калектыўна іх убіралі.

Многія новыя калгасьнікі самі выказваюцца за тое, каб абагуліць лён, калектыўна яго ўбраць і здаць дзяржаве. Але раённыя арганізацыі ніякіх паказаньняў аб гэтым не даюць, а наадварот часта адмаўляюць новаўступіўшым калгасьнікам абагуліць іх пасевы.

Гэту, яўна апартуністычную практыку ў рабоце райкалгассаюзу трэба безадкладна выкарчаваць.

Апімор

1-га верасьня—пачаць заняткі

Пачатак навучальнага 1931-32 году, зьвязан з вырашэньнем цэлага камплексу важнейшых пытаньняў культурнага будаўніцтва.

З 1 верасьня распачнуць работу рад новаарганізаваных вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў. Зараз праводзіцца карэнная рэарганізацыя такіх ВНУ, як БДУ і с.-г. Акадэмія. Уводзіцца ўсеагульнае абавязковае навучаньне на базе сямігодкі ў прамысловых цэнтрах прымежных раёнах і раёнах суцэльнай калектывізацыі. Уводзіцца ўсеагульнае дашкольнае выхаваньне. З пачаткам гэтага навучальнага году ўся сыстэма народнай асьветы павінна быць поўнасьцю пастаўлена на рэйкі палітэхнізму. І, нарэшце 1931-32 навучальны год—гэта год ЗАВЯРШЭНЬНЯ СУЦЭЛЬНАЙ ПІСЬМЕННАСЬЦІ працоўных мас БССР.

З Такім чынам навучальны год паставіў перад партыйнымі, савецкімі, прафсаюзнымі і камсамольскімі арганізацыямі адказьнейшыя і складаныя задачы.

Праз 6 дзён у школах, тэхнікумах, ВНУ павінна пачацца навучаньне. Таму ўжо СЁНЬНЯ ЧАС ДАЦЬ АДКАЗ на тое, у якой меры цэлы рад арганізацый і ўстаноў справіліся з паставленымі перад імі задачамі? ЦІ ЎСЁ ГАТОВА ДЛЯ ТАГО, КАБ 1 ВЕРАСЬНЯ РАСПАЧАЦЬ ЗАНЯТКІ?

Аналіз падрыхтоўчай работы дае на гэта пытаньне АДМОЎНЫ АДКАЗ.

На важнейшых і рашаючых вучастках падрыхтоўкі да навучальнага году ВІДАВОЧНЫ ПРАРЫЎ. У прыватнасьці, зусім дрэнна прасоўваецца справа друкаваньня і перасылкі ПАДРУЧНІКАЎ. За апошнюю пяцідзёўку надрукавана і здана на базу УСЯГО ЧАТЫРЫ назвы падручнікаў.

Процант надрукаваных і пасланых у раёны падручнікаў НЕ ПЕРАВЫШАЕ 25-30. 76 назваў падручнікаў і палітпадручнікаў ЗАТРЫМАЛІСЯ Ў ВУТАРАЎ, Галоўліце, у мэтадкоме і друкарні.

Дзе-ж прычыны такіх недапушчальна-марудных тэмпаў?

Работнікі БДВ і друкарні асноўную прычыну бачаць у недахваце паперы. Не адмаўляючы таго, што недахват паперы затрымлівае друкаваньне, мы з усёй катэгарычнасьцю АБВЯРГАЕМ ГЭТУ ПРЫЧЫНУ, ЯК АСНОЎНУЮ.

Апэрацыйныя зводкі ад 15 і 20 жніўня паказваюць, што з-за недахвату паперы ня друкуюцца 11 назваў з 76. З гэтых-жа зводак відаць, што за апошнюю пяцідзёўку набран УСЯГО АДЗІН падручнік і . набор паступіў ТАКСАМА АДЗІН.

Як відаць, галоўныя тормазы знаходзяцца НА ШЛЯХУ ПРАСОЎВАНЬНЯ ПАДРУЧНІКАЎ АД АЎТАРА ДА ДРУКАРАНЬ. Інакш не магло-б атрымацца таго, што з 76 назваў гатовых да друку друкуюцца толькі 25.

Па-ранейшаму АДСТАЕ ВУЧАСТАК ЗУДАЎНІЦТВА І РАМОНТУ ШКОЛ. Тут больш чым дзе ПАНУЕ САМАЦЁК, ЭЛЕМЭНТЫ ГАЛАВАЦЯПСТВА, БЮРАКРАТЫЗМУ. У гэтай галіне квітнее такое зло, як абязьлічка.

На самай справе. Пры Н К А ёсьць бу даўнічы аддзел. Аднак ён не наладзіў як сьлед кантролю за ходам будаўніцтва, ён нават ня мае весткі аб становішчы гэтай работы ў раёнах. Тое-ж самае і на мясцох: райінспэктар нарасьветы абяцаў гэтага часу не закончан ВУЧОТ ДЗІЦЯЧАГА КАНТЫНГЕНТУ, які падлягае ўсеагульнаму навучаньню ў 1931-32 годзе. Адсутнасьць вучоту можа таксама ЗАТАРМАЗІЦЬ пачатак навучаньня. Гэта трэба ўлічыць у першую чаргу тым раёнам, дзе ўводзіцца ўсеагульнае навучаньне на базе сямігодкі.

Даўно час кожнаму раёну мець зусім яснае ўлічэньне наконт колькасьці дзяцей адпаведнага кантынгенту для таго, каб забясьпечыць іх школьным памяшканьнем і педагагічнымі кадрамі.

Правядзеньне ПАЛІТЭХНІЗАЦЫІ, як асноўнага прынцыпу навучаньня, прадпалагае значныя патрабаваньні на падрыхтаваныя ў палітэхнічных адносінах педагагічныя кадры. Неабходна пакласьці ўвагу аб тым, каб выпускнікі, як падтэхнікумаў, так і асабліва курсаў, мелі Ў ДАСТАТКОВАЙ колькасьці палітэхнічныя і мэтадычныя веды.

Неабходна хутчэй ажыцьцяляць дырэкты

ПЕРАМОГА ЧЫГУНАЧНІКАЎ ГОМЕЛЯ

БАРАЦЬБА ЗА ПРАМФІНПЛЯН

ЛЕС ПРАМФІНПЛЯНУ «Героя працы» ВЫРАШАЕЦЦА НА ТАРФЯНЫХ ПАЛЁХ

РАБОЧЫ КАЛЕКТЫЎ ТОРФАЗАВОДУ „ШЛЯХ САЦЫЯЛІЗМУ" АБАВЯЗАН ПА-ПРАЛЕТАРСКУ ДАПАМАГЧЫ У ВЫВАЗЦЫ ТОРФУ ДЛЯ ФАБРЫКІ

12 тон рэек і вузкарэйкавы паравоз павінны быць неадкладна даны „Герою працы"

ПРАДПРЫЕМСТВУ—УДАРНАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ!

Добруская фабрыка, якая зьяўляецца адным з буйнейшых папяровых прадпрыемстваў у СССР, выробляе вышэйшыя гатункі паперы, займаючы асноўнае месца ў балансе выпрацоўкі культурнай паперы.

Кожная тона недаданай краіне паперы балюча адбіваецца на тыражы навых часопісяў, на выпуску падручнікаў, на ступені задаваленьня вучняў спыткамі і г. д.

КАРЭНЬНІ ПРАРЫВАЎ

З якімі-ж паказальнікамі ўступіла добруская фабрыка ў другое паўгодзьдзе бягучага году? Фабрыка перажывае найгрыбейшы прарыў па ўсіх без выключэньня лініях сваёй вытворчай праграмы. **Замест 17 з лішкам тысяч тон за першае паўгодзьдзе 1931 г. фабрыка атрымала ад добрускай фабрыкі менш 5 тысяч тон.** Такім чынам, процант выкананьня праграмы складае ганебнейшую лічбу—27,5 проц. Па частцы паказальнікаў прадукцыйнасьці працы на адзін чалавека-дзень фабрыка выканала ўсяго 32 проц. плянавага заданьня, давёўшы разам з тым процант нявыхадаў на работу да 20,53 проц. (а іх чыстых прагулаў 1,13 проц.).

Прастої самачарпалак, прадугледжаныя плянам у 6,3 проц., фактычна склалі 62,5 проц.

У чым заключаюцца асноўныя карэньні такога, зусім выключнага па сваіх паказальніках, прарыву?

Адказ на гэта пытаньне з вычарпальнай паўнатой мы знаходзім у гістарычнай прамове тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў. Добруская фабрыка «Герой працы» можа служыць бліскучай люстрацыяй да ўсіх палажэньняў прамовы тав. Сталіна.

Поўная абязьлічка, адсутнасьць сапраўднага гаспадарчага разрахунку, адзіначальля, недаацэнка ролі вядучых прафэсій, адсутнасьць арганізацыі кіраўніцтва і працы—вось першы цыкль прычын прарыву на Добрушы.

Новаму кіраўніцтву як гаспадарчаму, так і партыйнаму і прафэсыянальнаму прышлося неадкладна з усёй рашучасьцю пастаніць пытаньне аб **карэннай арганізацыйнай перабудове на фабрыцы.**

Побач з гэтым паўстала праблема жорсткай ліквідацыі абязьлічкі і вымены сыстэмы аплаты працы. На фабрыцы ёсьць прыклады такога парадку, што высокакваліфікаваны машыніст на турбіне атрымлівае 120 руб., а чорнарабочы ў мэханічным цэху выганяе каля 200 руб. у месяц.

ПАГРОЗА ЗРЫВУ ПЛЯНАЎ НЕ АДВЕДЗЕНА

Аднак, паміма гэтых агульных, асноўных прычын прарыву мы маем на Добрушы **рад ускладненьняў тэхнічнага парадку.** Навыразнаная своячасова пытаньні гэтага парадку пагражаюць для фабрыкі надзвычай цяжкімі вынікамі, аж да поўнага зрыву яе работы.

Першае месца ў гэтым цыклі займаюць пытаньні **сілавой гаспадаркі фабрыкі і торфазабесьпячэньня.**

Пабудаваная па апошнім слове тэхнікі новая сілавая станцыя з катламі высокага ціску з сучаснай, змантаванай замежнымі спэцыялістамі, турбінай на 3.500 клв. **разлічана на высокакаясны кавалкавы торф з вільготнасьцю да 30 проц.** Паступае-ж на фабрыку торф у значнай ступені крохамі, з вільготнасьцю да 50-60 проц. Самыя запасы торфазаводу прыкладна на палову складаюць запасы мінулых год. **Кавалкавага торфу фабрыка мае ня больш паловы тай колькасьці, якая ёй патрабуецца.**

АДЗІНЫ ВЫХАД— РЭКАНСТРУКЦЫЯ ТОПАК

Адзіны выхад, ня гледзячы на новыя расходы,—**рэканструкция топак на апальваньне машаніны крошкі і кавалка.** Гэта рэканструкция, калі мы хочам абмінуць спыненьня фабрыкі, павінна быць праведзена **ў парадку звышударным.** Ня гледзячы на ўсю важнасьць гэтай работы, «Аргэнэрга», якому было здана праектаваньне, сарвала арыентовачна намечаны тэрмін—22 жніўня і ёсьць падставы пакаёцца, што і повы, паказаны ім тэрмін—10 верасьня, ня будзе вытрыман.

МАНТАЖ— НА ЗВЫШУДАРНЫЯ ТЭМПЫ

Калі да гэтага тэрміну **дадаць час,** неабходны для **мантажу, то належыць** прыспаць, што становішча ўжо зараз робіцца пагражаючым. Неабходна мабілізаваць вакол гэтага пытаньня грамадзкасьць, прымусіць «Аргэнэрга» паварушыцца, аказаць рэальную дапамогу фабрыцы пры работах на мантажы. Час не чакае, восень на носе, марудносьць пагражае сур'ёзнейшымі вынікамі.

Адначасова стаіць з надзвычайнай вострасьцю пытаньне **падвозкі торфу** да чыгуначнай магістралі, што вядзе да падвесной дароги фабрыкі.

У БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ ДАЦЬ РЭЙКІ, ПАРАВОЗ, ТРАКТАРЫ

Узаемаадносіны фабрыкі з торфазаводам, бясспрэчна, ненармальныя. **Торфазавод,** ня гледзячы на тое, што фабрыка зьяўляецца яго адзіным спажыўцом, бяздушна-фармальна спасылаючыся на пастанову ўраду аб тым, што вывазка кладзецца на спажыўца, **адмаўляецца пальцам аб палец стукнуць, каб дапамагчы гэтай рабоце фабрыцы.** Торф раскідан на вялізнай тэрыторыі невялікімі выспачкамі па адлегласьці некалькіх кілёмэтраў ад чыгуначнай веткі. Транспарт, які ёсьць на балоце ў «Гэроя працы» ў выглядзе **двух старых паравозаў. І наяўная колькасьць рэек ні ў якай ступені не забясьпечвае магчымасьці вывазкі торфу.**

Удалося атрымаць для Добрушу нарад на 106 тон рэек і на 2 трактары, якія павінны выканаць функцыі трэцяга паравоза на балоце. Работнікі фабрыкі крыху вальней уздыхнулі, але якое-ж іх было расчараваньне, калі **нарад на рэйкі аказаўся на верасень месяц з дастаўкай іх у Енакіева водным шляхам, што, вядома, выключае магчымасьць іх паступленьня ў бліжэйшыя рэшаючыя дні.** Сталінградскі-ж трактарны на тэлеграму фабрыкі наогул адказаў, што распараджэньня яшчэ зусім ня мае. Саюзпапера, якая сапраўды павярнулася цяпер тварам да Добрушу, выдала са сваіх рэсурсаў фабрыцы яшчэ 2 грузавічкі, але тэрміны прыбыцьця іх з Ніжагародзкага аўтазбораччнага таксама, відавочна доўгія.

Трэба цьвёрда ўясьніць сабе, што **бесьперабойная работа Добрушу зараз вырашаецца на палёх сьцінкі торфу.** Поэна гаварыць аб тым, што трэба было гэтыя пытаньні ставіць яшчэ раней, увесну. **Добрушу зараз патрэбна неадкладная рашучая дапамога. Патрэбны рэйкі.** 106 тон мала. Патрэбна ва што-б там ні стала даць яшчэ такую-ж колькасьць, хаця-б старых, хаця-б з браку. Ужо **атрыманы нарад павінен быць рэалізаваны, як звыштэрміновы, у жніўні,** вядома, з дастаўкай чыгункай. **Трэці вузкакалейны паравоз. Добрушу павінен быць неадкладна дан.** Натуральна **два трактары паравоза не заменяць. Разам з тым тэрмін атрыманьня гэтых трактараў, як і аўтамашын, павінен вылічацца днямі.** Павінна быць аддана неадкладна распараджэньне аб адгрузцы як тых, так і другіх Сталінградскаму трактарнаму і Ніжагародзкаму аўтазбораччнаму.

ПАТРЭБНА ДАПАМОГА РАБОЧАЙ ГРАМАДЗКАСЬЦІ

Добруш займае настолькі буйное месца ў папяровай прамысловасьці і хавае ў сабе настолькі вялікія магчымасьці, што можа разьлічваць на мабілізацыю вакол пытаньняў, якія зьяўляюцца для яго рашаючымі, усёй рабочай грамадзкасьці.

Магчымасьці-ж у Добрушу вялікія. Ужо зараз, пры пастаянных перабоях з торфам, удалося дасягнуць выпрацоўкі ў 73 тоны (пры 100 тонах сутачнага заданьня). За першую палову жніўня выпрацоўка склала 49 проц. праграмы. Лічба, вядома, ганебнейшая, але ўсё-ж яна паказвае сабою рух наперад, супроць 24 проц. у першым паўгодзьдзі.

Яшчэ ў адным пытаньні Добрушу неабходна дапамога. Людзі. Калі толькі лічыць, што на фабрыцы, амаль з 2 з паловай тысячамі рабочых, не замешчаны пасады пам. дырэктара па працы, пам. дырэктара па рабочых прапановах, заг. аддзелам забесьпячэньня, заг. плянава-эканамічным аддзелам, няма галоўнага мэханіка, няма заг. мэханічнай майстэрні, няма работніка па кадрах і г. д., то становішча само сабою стане ясным.

Саюзпапера зусім правільна абвясьціла Добруш звышударным прадпрыемствам. Значэньне Добрушу для справы культурнай рэвалюцыі зусім выключнае. Фабрыка «Герой працы», маючы ўсе прадпасылкі для далейшай бесьперабойнай работы, чакае, каб зараз ёй была аказана сапраўдная тэрміновая дапамога, каб вакол пікэтацыі прарыву на Добрушы мабілізаваўся друк і наша грамадзкасьць.

ЮШКОЎ.

АБТОЧКА паравозу за тры дні

замест ранейшых 12

ГОМЕЛЬ. (Наш спэцкор.)

Барацьба за рэалізацыю задач, паказаных у прамове тав. Сталіна, прынесла значны зрух у рабоце **Гомельскага дэпо.** Рабочыя дэпо атрымалі буйную вытворчую перамогу ў правядзеньні рамонту паравозаў.

За ліпень у старым дэпо прастої паравозаў на абточцы ў сярэднім складалі 12,4 дня

Рацыяналізацыя работы дэпо на практыцы паказала, што прастої паравозаў пры выразнай і правільнай расстаноўцы рабочай сілы можна значна скараціць.

На обточку быў пастаўлен вопытны паравоз С 249. Бюро рацыяналізацыі дэпо Гомель усебакова прапрацавала плян рамонту паравоза. Былі зроблены графікі работ паасобных брыгад, пэхаў і рабочых з указаньнем паасобных гадзін і хвілін правядзеньня тэй ці іншай вытворчай аперацыі. Усе пытаньні былі прапрацаваны непасрэдна на вытворчасьці з удзікам усіх рэальных магчымасьцяй.

У гэтыя дні рабочыя працавалі, як ніколі. Рэжа кідалася ў вочы асаблівая выразнасьць у кожным руху. Не чакаючы поўнай разборкі паравоза, рабочыя распачалі рамонт яго паасобных частак. Па кожны дзень быў распрацован дэтальны графік рамонту. Пляны і парадак работ былі даведзены да кожнага рабочага і гэта дало магчымасьць своячасова заўважыць вузкія месцы і іх ліквідаваць.

За першую вячэрнюю зьмену група экіпажнікаў і дышлавікоў разабрала поўнасьцю паравоз, падрыхтавала яго да пад'ёмкі, а поршневая група далажам выканала ўсе асноўныя заданьні па рамонце.

Экіпажная група зрабіла рамонт тормазнага абсталяваньня, а дышлавая група за вячэрнюю зьмену сабрала дышлы і аддала падшыпнікі ў выплаўку

Ударнікі рамантуюць паравоз у нерабочы час.

На другі дзень рамонту з 8 гадзін да 10 г. 45 хв. раніцы была праведзена пад'ёмка паравоза, а з 10 г. 50 хв. былі выкачаны скаты і цялежка для разборкі буксаў. Увечары ўжо былі напраўлены буксавыя скрынкі і буксавыя падшыпнікі.

На трэці дзень раніцой пачалі тачыць поршневыя кольцы і рабіць кавальскія работы. Точку скончылі за 15 гадзін, а зьмена паршнявікоў прыгнала замкі і аддала іх у медніцкую для падрыхтоўкі да абточкі.

13-га жніўня кацельшчыкі яшчэ з раніцы прыступілі да правядзеньня сваіх работ згодна графіку. Такім чынам паравоз прабыў у рамонце з 16 гадзін **12-га** жніўня да 23 гадзін **15-га** жніўня.

Лепшымі ўдарнікамі праявілі сябе рабочыя **Паповіч, Жалезьнякоў, Дымко, Хамакоў, Сухаў, Мурын, Махараў, Жарын, Корзун, Бажко, Катлярэнка, Сярпнеўскі, Штэрмэр, Ракаў, Рудзянкоў, Кавакоўскі, Кіўла, Пацаюк, Тэнгер, Давідовіч, Жукаў, Кучаў, Перухаў, Кутрапас, Пятрухоў і Дзяргач.**

Рабочыя і тэхнэрсанал дэпо паказалі сапраўдныя ўзоры плянавай работы па рамонце паравозаў.

Зьніжэньне прастояў паравозаў дасьць дзесяткі тысяч рублёў эканоміі.

На сваім агульным сходзе рабочыя і тэхнічны пэрсанал дэпо ўзялі на сябе абавязацельствы і надалей.

«не здаваць тэмпаў у барацьбе за правядзеньне абточкі ў 3 дні».

Б. Зэльманаў.

„У наикарацейшы тэрмін забясьпечыць сапраўдны пералом у справе грамадзкага харчаваньня"
(з пастановы ЦК УсеКП(б))

Да 15-га верасьня

ПЕРАВЕСЬЦІ ПРАДПРЫЕМСТВЫ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ НА ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК

ЦП саюзу грамадзкага харчаваньня *ВЫЗНАЧЫЎ РАД МЕРАПРЫЕМСТВАЎ* па рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б)

Прэзыдыум ЦП саюзу грамадзкага харчаваньня, прапрацаваўшы пастанову ЦК УсеКП(б), аб паляпшэньні грамадзкага харчаваньня вызначыў рад практычных мерапрыемстваў па рэалізацыі дырэктывы ЦК.

Прэзыдыум ЦП звярнуўся ў СНК БССР з просьбай аб арганізацыі пры ім, а таксама пры гарсаветах камітэтаў садзейнасьці грамадзкаму харчаваньню.

Абвяшчаецца **дэкадзін збору сродкаў** на паляпшэньне санітарнага становішча сталовых. Адначасова пры сэкцыях грамадзкага харчаваньня арганізуюцца курсы для папулярызацыі санітарных ведаў сярод работнікаў сталовых.

Не пазьней 1-га верасьня павінны быць вызначаны **бракеры** на прадпрыемствах, якія выпускаюць звыш 5.000 страў (Менск сталоўка № 3, Віцебск № 1, 17 і 25, Гомель — № 2, Бабруйск кухня-разьмеркавацель і Рэчыца фабрычная сталоўка). У астатніх сталовых для самакантролю над якасьцю прадукцыі будуць створаны **тройкі** ў складзе загадчыка сталоўкі, старшага кухара, прадстаўніка камісіі сталоўкі пад кіраўніцтвам інструктароў па якасьці пры сэкцыях грамадзкага харчаваньня. Пры Белкаапхарчы арганізуецца лябараторыя для дасьледваньня выпускаемай прадукцыі.

Саюз грамадзкага харчаваньня зьвярнуўся ў ЦСПСБ з просьбай аказаць дапамогу ў скончэньні ў 1931 г. будаўніцтва сталовых на фабрыках **«Дзьвіна», Вітьбэя, пянчошнай і Метпрому ў Віцебску; заводах «Камунар», Дрэваапрацоўшчык» і ў Ляхаўскім рабочым раёне ў Менску.**

Белкаапхарчу прапанавана на працягу верасьня **перавесьці 30 сталовых БССР на паблюдную сыстэму,** ліквідуючы стандартнасьць абедаў і ўвёўшы розныя блюды на розных цэнах. Да 1-га кастрычніка павінна быць уведзена абслугоўваньне 3-хзьменных прадпрыемстваў грамадзкім харчаваньнем.

Да 1-га верасьня аўтаномныя сэкцыі грамадзкага харчаваньня і групы Саюзу павінны ўвесьці простую зьдзельшчыну на ўсіх сталоўках, а прагрэсыўную зьдзельшчыну ў 5 Менскіх прадпрыемствах грамадзкага харчаваньня, 3-х Віцебскіх, 2-х Гомельскіх і на адным прадпрыемстве ў Бабруйску і ў Рэчыцы. Для падрыхтоўкі тарыфна-нармовачных работнікаў пры Белкаапхарчы ствараюцца кароткa-тэрміновыя курсы.

Прызнана патрэбным арганізацыя ў **Менску, Віцебску, Гомелі, і Бабруйску** спэцыяльных пральен для абслугоўваньня прадпрыемстваў, а таксама прыстасаваньне двух-трох заводаў па выробе інвэнтару для патрэб грамадзкага харчаваньня.

Вызначаны таксама рад мерапрыемстваў па паляпшэньні матар'яльна-бытавога становішча работнікаў грамадзкага харчаваньня, ліквідацыі абязьлічкі ў сталоўках, укарапеньні гаспадарчага разрахунку, узьнікненьні працыдысцыпліны, разгортваньні сацспаборніцтва і г. д.

Да 15 верасьня павінны быць пераведзены на гаспадарчы разрахунак усе прадпрыемствы прапускной здольнасьці ня менш 1.000 абедаў. Прадпрыемствы з прапускной здольнасьцю ў 5.000 абедаў павінны быць пераведзены на самастойную загатоўку прадуктаў і сыроду.

Перад Белкаапсаюзам пастаўлена пытаньне аб арганізацыі факультэту грамадзкага харчаваньня пры Інстытуце спажывецкай кааперацыі.

Для практычнай дапамогі ў рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) у Бабруйск, Гомель і Віцебск выехалі работнікі ЦП Саюзу грамадзкага харчаваньня.

26-га жніўня склікаецца парада ўсіх кухароў і вытворчых сэктараў групкомаў саюзу грамадзкага харчаваньня.

26-га жніўня—загадчыкаў сталовак і прафактыву. 4-га верасьня адбудзецца зьлёт ударнікаў для практычнай прапрацоўкі пастановы ЦК УсеКП(б).

НА ЗАВОДЗЕ „БАЛЬШАВІК"

ЦЭХ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ ПЕРАБУДОЎВАЕ СВАЮ РАБОТУ

МЕНСК, 23. (БЕЛТА). У рабоце сталоўкі гарбарні «Бальшавік» ёсьць значныя эрухі. Закрыты разьмеркавальнік МІРК перайшоў пад кіраўніцтва заводзкага рабочага кааператыву. Сталоўка перайшла на гаспадарчы разрахунак. Забесьпячэньне сталоўкі прадуктамі значна палепшылася і жакэць абедаў значна павысілася. Апрача сталоўкі на заводзе адкрыты яшчэ два буфэты, якія таксама працуюць на гаспадарчым разрахунку. Лепшыя працаўнікі сталоўкі прэміюцца разам з іншымі ўдарнікамі гарбарні. Сталоўка гатуе сьнеданьні, абеды і вячэры. Начная зьмена таксама забясьпечваецца гарачай стравай.

Але трэба сказаць, што апрача гэтых станоўчых бакоў рабочай сталоўкі ў ёй пануе дагэтуль антысанітарнае становішча. Падлога брудная, нібы ніколі ня мыецца. Надзвычай малое памяшканьне сталоўкі, рабочыя зьмены не зьмяшчаюцца ў ёй. Таму дарэмна марнуецца рабочы час, бо прыходзіцца стаяць у чарзе. У сталоўцы дагэтуль пануе абязьлічка.

Не сталоўка,—адцемны барак

МЕНСК, 23. (БЕЛТА). Ня гледзячы на тое, што ў сталоўцы фабрыкі «Кастрычнік» ёсьць усе тыя недахопы, якія канстатаваны ў пастанове ЦК УсеКП(б), як антысанітарнае становішча, недахват інвэнтару, абязьлічка ў рабоце сталоўкі і інш., дагэтуль праўленьне ЗРК не прапрацавала гэтай пастановы і ніякіх канкрэтных мер па ажыцьцяўленьні яе не прыняло. На сходзе абслугоўваючага пэрсаналу сталоўкі абгаварвалася пытаньне аб лепшым забесьпячэньні харчаваньнем рабочых, але ўсе прапановы засталіся толькі на словах.

У сталоўцы штодзенна харчуецца 2.500 рабочых. Абсталяваньне сталоўкі надзвычай дрэннае. Сталоўка прадстаўляе сабою цёмны барак, дзе пануе ганебная антысанітарыя. Падлога ў сталоўцы заўсёды мокрая, брудная. Калі пройдзе дождж, дык вада цячэ ў сталоўку. Ля сталоўкі няма нават дапушчальнага трацуару — прыходзіцца ісьці ў сталоўку па граязі і несьці яе ў сталоўку. Унутры сталоўкі на сталах вяжецца папера з атручанымі мухамі. На кухні таксама бруд.

ПЕР ДЗЮКЛО

РАБЫ ПРАБУДЖАЮЦЦА

I.

Возьмем «мэтро» на любой з станцый лініі вароты Малот-Вэнсэн і накіруемся з вамі сёньня ў вэнсэнскі лес — прадмесьце Парыжу, дзе цяпер з урачыстай помпай адкрылася выстаўка калёніяльных дасягненьняў французкага імпэрыялізму.

О! На гэтай калёніяльнай выстаўцы можна ўбачыць вельмі многа цікавага. У прыгожа пабудаваных павільёнах то ў арабскім, то ў туніскім, то ў індакітайскім стылі раскладзена рознастайная прадукцыя ўсіх гэтых заморскіх краін: дываны, мароканскія вырабы, ром усіх гатункаў і ўсякай моцнасьці, самыя тонкія шоўкі, віно і шмат іншага.

Прадстаўлен на гэтай калёніяльнай выстаўцы і «быт» калёніяльных падлеглых Францыі народаў. Зразумела, у гэтай галіне паказу вельмі многага, на наш погляд вельмі істотнага, не хапае. Напрыклад, там ня знойдзем мы маёмасьці бізуноў, якімі калёніяльныя наглядальнікі б'юць сваіх «вольных» рабочых у лясных нэтрах Сэнэгалу або Анаму. Там ня знойдзем мы і маёмасьці ланцугоў і кайдалоў, з дапамогай якіх «цывілізуюць» калёніязатары «няўдзячных бунтаўшчыкоў» Індакітаю або Тунісу. Там ня знойдзем мы таксама ні дыяграм, ні сапраўдных лічбаў, якія-б гаварылі нам аб патрэбах анамітаў або алжырцаў, аб вялізарнай сьмяротнасьці, аб катаваньнях і аб масавых зьбіваньнях... Вельмі многага, што нас, галоўным чынам, цікавіць, ня знойдзем мы па зусім зразумелых для нас прычынах на калёніяльнай выстаўцы ў Вэнсэне.

Але затое мы ўбачым там замысловатыя гарнітуры тубыльцаў, маёмасьці іх памяшканьняў, на рэдкасьць прыгожа адбудаваныя маёмасьці іх аброї і хатніх рэчаў. На шматлікіх эстрадах нам паказуць самыя замысловатыя погрыцянскія і анамітскія скокі. На дыяграмах пануючы французкі імпэрыялізм пакажа, колькі мільёнаў і мільёнаў залатых франкаў выграблі Гэпольды, Сітроены і Коці з калёній, зразумела, «забыўшы» ўспомніць аб тым, колькі сотень і сотень тыс. калёніяльных рабоў загінула ў імя гэтых мільёнаў і мільёнаў зал. франкаў. Але чаго варта на вазе капіталу мізэрнае жыцьцё якога-небудзь няшчаснага сэнэгальца або анаміта!

Можам мы ўбачыць на калёніяльнай выстаўцы ў Вэнсэне і іншыя даволі павучальныя відовішчы. Напрыклад, з вялікай помпай акружаны ганаровай вартай, разам з прэзыдэнтам французкай рэспублікі пядаўна наведаў гэту выстаўку «сам» яго вялікасьць султан марараканскі.

Яго вялікасьць застаўся вельмі задаволеным усім тым, што ён тут убачыў. І чаму-ж яму ня быць задаволеным, калі пэнсія яго, што выплачваецца яму французскім урадам, раўняецца двум мільёнам франкаў (200 тыс. руб.) у год? Ну, а што ў гэты час французкія калёнізатары катуюць яго краіну, фізычна зьнішчаюць яго народ, — дык якая-ж, уласная гаворачы, да гэтага справа яго вялікасьці султану марараканскаму?!

Не! нам рашуча няма чаго рабіць на гэтай калёніяльнай выстаўцы ў Вэнсэне. Пераплывем лепш блакітнае Міжземнае мора, зірнем лепш з вамі ў самыя нэтры французкай калёніяльнай імпэрыі...

Мы сёньня запрашаем вас у Індакітай.

II.

Пасьля «пераможнага» пакаронньня Індакітаю «нацыянальным героем» Францыі генэралам Фэры, французкі капіталізм з прагнасьцю накінуўся на гэту багатую калёнію, якая прыносіць капіталістам такія вялікія прыбыткі.

Ён аўладаў тымі вялізарнымі зямельнымі абшарамі, пабудаваў там шмат фабрык, заводаў, апрацоўвачых сырэц майстэрань... Уся гісторыя экспляатацыі французкім капіталізмам Індакітаю — гэта суцэльнае грабяжніцтва, ашуканства, гвалт...

Партыя індакітайскіх нацыяналістаў Віет-нам, якая раней мела ў сваіх радах (падобна кітайскаму Гаміндану) як прадстаўнікоў дробнай буржуазіі, так і прадстаўнікоў індакітайскіх рабочых (кулі) і індакітайскага селянства, дзякуючы моцна ўдарыўшаму і па Індакітаі сусьветнаму эканамічнаму крызісу, вельмі хутка была ўцягнута (часткова нават наперакор волі яе дробна-буржуазных кіраўнікоў) у рэвалюцыйную дзейнасьць. Паўстаньне ў Іен-Бан у лютым (з 9-га па 16-га) 1930 г., ня гледзячы на яго няўдачу, было адным з самых гераічных эпізодаў гэтай разгорнутай барацьбы за нацыянальную незалежнасьць Індакітаю.

Аднак, з аднаго боку, усё больш узрастаючы эканамічны крызіс, з другога — прыклад Савецкага Саюзу які будуе сацыялізм, і вострая клясавая барацьба ў суседнім Кітаі — усё гэта спрычыніла вельмі хуткай перагрупоўцы, вельмі хуткай дыфэрэнцыяцыі клясавых сіл і ў цэнтрах самога Індакітаю.

Аспоўнае ядро нацыяналістычнай партыі Віет-нам — г. зн. дробная буржуазія — пачало хісцацца. Ісьці далей па рэвалюцыйным шляху — гэта значыць дайсьці да камунізму з яго адмаўленьнем прыватнай уласнасьці і іншымі, прыкрымі для дробнага буржуа вывадамі. Не, ужо лепш, бадай, пайсьці на зьлезку з французскім імпэрыялізмам, лепш пастарацца з дапамогай гэтага французскага імпэрыялізму распладзіцца з эканамічным крызісам кінэзнямі і сьпінамі рабочых і беднякоў-сялян.

III.

Зрабіла адпаведныя вывады з існуючага становішча хоць і маладая, але ўжо даволі загартаваная ў клясавых баёх камуністычная партыя Індакітаю. Яны вывавы ўрок здрадніцтва справе рабочай клясы кітайскім Гаміндапам не прайшоў бясьсьледна для індакітайскіх камуністаў. Яны рашуча рвуць усе свае сувязі з нацыяналістычна-настроенай буржуазіяй Індакітаю. **Яны бяруць поўнасьцю ў свае рукі кіраўніцтва барацьбой рабочых і сялянскіх мас сваёй краіны.**

Наколькі пасьпяхова вядзецца гэта барацьба, аб гэтым мы можам меркаваць хоць-бы з дакладу крывавага французскага дыктатара Індакітаю генэрал-губернатара калёніі Паск'е.

«Пачынаючы з сакавіка 1930 г., камуністычная партыя ўзяла поўнасьцю ў свае рукі кіраўніцтва прапагандай» — прымушаны быў прызнацца ў далёка ідэрымных яму фактах Паск'е перад вышэйшай радай (буржуазная ўстанова, якая разам з генэрал-губернатарам кіруе калёніяй) Індакітаю. «Менш чым за год камуністычная партыя аднявола свае сілы, дысцыплінавала сваіх членаў і пачала арганізоўваць усюды забастоўкі. Адначасова з гэтым камуністычная партыя стараецца ўсюды арганізоўваць селянскія і рабочыя саюзы, таксама, як і саюзы камуністычнай моладзі».1)

Нявольнае, вымушанае сьведчаньне Паск'е аб вялікіх посьпехах КП Індакітаю ў яе барацьбе супроць французкага і індакітайскага капіталізму нам вельмі каштоўна. Яно паказвае, наколькі вялізарны посьпехі індакітайскіх камуністаў, калі гэтыя посьпехі прыпаюцца нават клясавымі ворагамі.

Адзінаццаты пленум Камінтэрну прызнаў камуністычную партыю Індакітаю (да таго толькі сэкцыю кампартыі Францыі) незалежнай сэкцыяй Камуністычнага Інтэрнацыяналу.

Сваёй барацьбой супроць капіталу, сваёй арганізаванасьцю, сваім уменьнем, ня гледзячы на маладосьць, кіраваць рабочымі масамі сваёй краіны — такога давер'я з боку штабу сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі камуністычная партыя Індакітаю поўнасьцю заслужыла.

IV.

Перш чым перайсьці да апісаньня рэвалюцыйных падзей, якія маюць цяпер месца на тэрыторыі Індакітаю, спынімся коранёнка на матар'яльным становішчы індакітайскага кулі (рабочага) паглядзім, у якіх умовах ён працуе.

Індакітайскі кулі зарабляе ў сярэднім каля 40 центаў (каля 80 кап.) за дзесяцігадзінны рабочы дзень. Фактычна яго заработак нават значна меншы гэтай і без таго ўжо даволі мізэрнай сумы. Меншы таму, што, па-першае, падпісваючы кантракт з фабрыкантам на работу ў яго на працягу ня менш двух год, кулі атрымлівае ад фабрыканта пэўны грашовы аванс у лік зарплаты. Гэты аванс, які даецца фабрыкантам для таго, каб ім канчаткова зьвязаць рабочага, утрымліваецца з зарплаты кулі. Па-другое, бясконцыя штрафы, якія, як з «рога изобилия» сыплюцца на рабочага, моцна скарачаюць заработак апошняга. Нас запытаюцца, навошта ў такім выпадку кулі бярэ гэты аванс? Ён бярэ яго таму, што пасьля многіх тыдняў, а то і месяцаў беспрацоўя, пачаўшы працаваць, без авансу яму ня будзе на што жыць да бліжэйшай палучкі.

Умовы кантракту складзены ў інтарэсах капіталістаў і накіраваны супроць інтарэсаў рабочага. Фабрыкант можа замяніць падзённую работу рабочага зьдзельнай, прычым сума заработку рабочага ў гэтым выпадку толькі не павінна быць менш яго падзённага заработку, г. зн. 80 кап. за 10-12-гадзінны рабочы дзень. Заўважце, што кантракт не гаворыць, колькі пайпен зьдзельна выпрацаваць рабочы за гэтыя 80 кап., вызначэньне нормы выпрацоўкі прадастаўляецца ў гэтым выпадку на поўную волю фабрыканта. Якое багатае поле для экспляатацыі кулі, які трапіў у дранежныя лапы калёніяльнага прадпрыемцы!

Паводле дагавору рабочы ня мае права пакідаць работу ў свайго гаспадара да скончэньня тэрміну дагавору, г. зн. на працягу двух год. Значыць гэтыя два гады ён знаходзіцца ў поўнай нявольніцкай залежнасьці ад фабрыканта. А што гэта залежнасьць у поўным сэнсе слова нявольніцкая, паказвае той факт, што калі кулі ўцячэ ад свайго гаспадара, яго ловяць паліцэйскія з сабакамі, закоўваюць у ланцугі і сілай вяртаюць на месца прымусовай працы.

Паводле кантракту рабочы мае толькі два дні адпачынку ў месяц (чатырнаццатага і васемнаццатага числа кожнага месяца — дні анамітскіх сьвяткаваньняў) і, зразумела, за гэтыя дні адпачынку ён не атрымлівае ні цэнта.

Калі ў пэрыяд моцы кантракту фабрыка пераходзіць да другога ўласьніка, дык ад гэтага кантракт ня траціць сваёй сілы. Рабочы пайпен працаваць далей у новага ўласьніка, незалежна ад таго, падабаецца яму гэта, ці не.

Дадамо да гэтага, што ў Індакітаі (як і ва ўсіх іншых калёніях) адбываецца фармальны гандаль рабочай сілай. Ёсьць спэцыяльныя прадпрыемцы, якія наажываюць вялікія капіталы на пастаўках на сутнасьці справы безабаронных нявольнікаў ня толькі на фабрыкі Індакітаю, але і на Гвіяну (французская калёнія з надзвычайна шкодным для здароўя кліматам) і на астравы Ціхага акіяну.

Вось умовы працы ў гэтай «шчасьлівай» і «квітнеючай» французкай калёніі. Ці-ж дзіўна пасьля гэтага, што сярод рабочых там часта выбухаюць паўстаньні, якія з нечалавечай жорсткасьцю задушаюцца ўзброенымі да зубоў платнымі агентамі французскіх і індакітайскіх капіталістаў.

V.

Мяркуючы па вельмі ўрывачных і няпоўных вестках, якія дайшлі да нас сапраўдная рэвалюцыя кінула і бурліць у Індакітаі. **У раёне Верхняга Анаму і ў Кахіншыне арганізаваліся саветы рабочых і сялян.**

Гэтыя саветы ня толькі арганізаваліся. Яны існуюць, працуюць, судзяць і распраўляюцца са сваімі клясавымі ворагамі, зьбіраюць падаткі з працоўнага насельніцтва, якім яны добраахвотна выбраны. **У раёне правінцый Вінх адбываюцца жорсткія бі паміж рэвалюцыйнымі атрадамі анамітаў і французскімі калёніяльнымі войскамі. Ва ўсім раёне паўночнага Анаму** (аламіцкае каралеўства, якое знаходзіцца пад апекаю Францыі), калі меркаваць па дайшоўшых да нас, паўтараем, мізэрных вестках, **даволі моцна трымаецца рабочая ўлада.**

Дваццатага чэрвеня ў вёсцы **Ан-Фу** рэвалюцыйная ўладай прыгаворая да пакаранньня сьмерцю 1 пакаран агент французскага імпэрыялізму, начальнік анамітскай паліцыі Ле-Ці. У другой вёсцы **Фан-Міу** былі пакараны сьмерцю многія другія адрадніку.

А ў гэты час французкая паліцыя, якая пачынае траціць галаву, лютуе. Яна арыштоўвае ў Парыжы выдатнага дзеяча індакітайскай кампартыі тав. **Тао,** высылае яго ў Індакітай, трымае яго там у суровай турэмнай ды нагляда паліцыі. Яна ў Індакітаі масамі арыштоўвае рабочых-анамітаў, аддае іх пад суд, зьбівае і катуе.

А французкія фашысты з пенай на губах заклікаюць у сваіх газэтах (напрыклад, газэта калёніяльных фашыстаў «Мнение» ад 13-га чэрвеня 1931 г.) да вабойства адвакатаў - камуністаў, якія па даручэньні МОПР'у павінны выступіць перад судом у Сайгоне (Індакітай) у абарону арыштаваных і прасьледваных рабочых-анамітаў. Быццам забойствам паасобных камуністаў можна спыніць рэвалюцыйны рух шматмільённых мас!

. . . . . .

Анаміт-нявольнік, які прайшоў пра атонь імпэрыялістычнай вайны, пра самую жорсткую экспляатацыю і эканамічны крызіс, ператвараецца ў рэвалюцыйнага анаміта - бойца.

Агнём клясавай барацьбы палае Індакітай... Рабы прабуджаюцца...

1) «Юманітэ», нумар 11.915, ад 29-га ліпеня 1931 г.

Сушка, уборка і вывазка здабытага торфу— зараз галоўнае

Аб'яднаны рэйд ударнікаў „Праўды" і „Зьвязды"

САНІТАРЫЮ цэхаў, сталовак і інтэрнатаў— У ПАРАДАК ДНЯ

ПАКОНЧЫЦЬ З АПАРТУНІСТЫЧНЫМ ІГНАРАВАНЬНЕМ ПЫТАНЬНЯЎ РАБОЧАГА БЫТУ

ГНЁЗДЫ БРУДУ І БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦІ

Рэйд, у якім знаходзяцца дамы жаксу № 20, мае шмат садоў. Пры ўмелай пастаноўцы работы і ініцыятыве праўленьня, гэты куток гораду можна было-б ператварыць у кузьню здароўя рабочых.

Але справа стаіць зусім інакш. Усе сьмяцьцёвыя скрынкі і прыбіральні дамоў пераапоўнены нячыстотамі, якія пералізаюцца праз берагі, забруджваюць сады і двары і напаўняюць смуродам вуліцу. Па Сьвярдлоўскай вуліцы ў доме № 19 бруд з памыйнай ямы цячэ ў сутарэньне. Па Сяргееўскай вуліцы ў адным з дамоў, студзня запоўнена брудам, які ідзе з уборнай.

На двары дому № 28 па вуліцы Валадарскага, у якім заўсёды гуляюць дзеці, знаходзіцца зусім адкрытая пальчатальная яма ў 30 метраў глыбінёй. Пад самымі вокнамі кватэры № 12 прадзяе смуродная жыжка, з-за якой немагчыма адкрыць вокны і дзьверы.

Па вуліцы Карла Маркса № 7/29 памяшканьне ў ніжнім паверсе закідана сьмецьцем, а сходні ператворацца ў месца для адкідаў. Ня ў лепшым становішчы знаходзяцца і дамы па Сяргееўскай вуліцы №№ 9/17 і 5/12.

Сталоўкі пры 3-м аддзяленьні міліцыі і «чырвоным крыжы» працуюць у цесных забруджаных памяшканьнях. У пакоі плошчай у 29 кв. метраў абедаюць калі 200 чалавек, прычым часта ядуць у калідорах і на вокнах. Сутарэньне—ў доме № 28 па вуліцы Валадарскага загружана леташняй гнілой бульбай і патрабуе неадкладнага рамонту, адтэрміноўка якога пагражае дому абвалам. Пад пагрозай абвалу таксама знаходзяцца кватэры №№ 5 і 6 дому № 22 па Сьвярдлоўскай вуліцы.

Жыльлёвая плошча ператыяльна рэгулюецца паміж жыхарамі. Напрыклад, на трэцім паверсе дому № 28 па вуліцы Валадарскага ў адным маленькім пакоі зьмяшчаецца да 6-7 чалавек, у той-жа час ёсьць кватэры дзе сям'я з 2-х асоб займае 2 пакоі.

Культурна-выхаваўчай работы сярод жыхароў жаксу не вядзецца. На запытаньне брыгады, ці ёсьць у вас ленінкуток, загадчык дамамі адказвае: «Але, і нават сталоўка ёсьць, толькі... не працуе».

Трэба адзначыць, што жоннкі рабочых, з-за адсутнасьці ясьляй і дзіцячай пляцоўкі, ня могуць ісьці на работу.

Адказнасьць за ўсе гэта нясе праўленьне жаксу, на чале з старшынёй Варысенкам.

Дэкаднік па санмінімуму зусім не закрануў жаксу № 20. Трэба, як сьлед, ударыць па праўленцах, якія абярнулі дамы жаксу ў гнёзды бруду і безгаспадарчасьці.

Брыгада «Праўды» і «Зьвязды» — Вішнеўскі, Бузінаў, Хадыка, Шушкевіч, Гінзр, Белы, Казюкевіч і Бусыгіна.

ПАКОНЧЫЦЬ З АНТЫСАНІТАРЫЯЙ НА ШВЭЙНАЙ ФАБРЫЦЫ

Пастановы аб ажыцьцяўленьні санмінімуму на швэйнай фабрыцы імя «Крупскай» ня выкананы.

Сталоўка, якая абслугоўвае 2000 рабочых, знаходзіцца ў антысанітарным стане. Памыйная выліваюцца ля сталоўкі. Вялізная колькасьць мух а сьмяцьцёвай ямы залетаюць у сталоўку і кладавыя, садзяцца на хлеб, страву і інш. харчовыя прадукты.

У цэхах фабрыкі не хапае вэнтылятараў, у паветры носіцца шмат пылу. Існуючыя вэнтылятары не ў парадку, а ў некаторых цэхах і зусім няма, як напрыклад, у ватным.

Уборка фабрыкі даўно не рабілася. Столь пакрыта павуцінньнем. Падлога мыецца вельмі рэдка і надзвычайна забруджана.

На фабрыцы працуе шмат рабочых, разы ў тры больш, чым дазваляе разьмер памяшканьня.

Двор завалены розным сьмецьцем—ватай, папорай, трэскамі і інш.

Трэба караўным чынам палепшыць санітарна-бытавыя ўмовы на фабрыцы Крупскай. Гэтага патрабуюць задачы выкананьня прамфінплану.

Брыгада «Праўды» і «Зьвязды» Чыкун, Бобрык, Мусьнэр, Цылько, Маслоўская, Якубоўская.

Санмінімуму нуль увагі (Абутковая фабрыка, Менск)

Санітарнае становішча абутковай фабрыкі зусім нездавальняючае. У цэнтры фабрычнага двара—вялікі ворах скуравых і палатняных абрэзкаў—капітоўнейшага ўцільсырцу, які ад доўгага ляжаньня над адкрытым небам, на палову згніў і зьяўляецца крыніцай смуроду. Па ўсім двары раскіданы стружкі, што стварае небясьпеку пажару. Па куткох ляжаць ворахі гною. Уборныя не ачышчаны.

Ня лепшае становішча і непасрэдна ў цэхах фабрыкі. Па калідорах — залежы бруду, якія месяцамі не прыбіраюцца. У большасьці цэхаў няма гатаванай вады і ўмывальнікаў. Ні ў адным цэху не абсталявана вэнтыляцыя.

У памяшканьні, дзе знаходзяцца бюро партыйнай ячэйкі і заўком, таксама панае антысанітарыя. Ворахі сьмецьця ляжаць у ёмкасьці кутку. Гэта даволі яркі характарызуе адносіны фабрычных арганізацый да санітарнага мінімуму.

Толькі ў апошнія дні дасягнут некаторы зрух у правядзеньні санмінімуму. Заводакіраўніцтва фабрыкі, адміністрацыя сталоўкі, фабком і мэдычны пункт заключылі паміж сабой сацыялістычны дагавор, у якім усе гэтыя арганізацыі абавязваюцца неадкладна ўзяцца за правядзеньне санмінімуму.

Фабрычныя арганізацыі павінны правесьці па-ўдарнаму дэкаднік «за чыстату і санмінімум», мабілізаваць вакол яго ўсю рабочую грамадзкасьць.

Брыгада «Праўды» і «Зьвязды»: КІПЕР, БАШМАКОВА, ДРУШЫН, СМОЛІН.

ТАКІХ ПАРАДКАЎ ДАЛЕЙ ЦЯРПЕЦЬ НЕЛЬГА

Фабрыка „Камунарка"

Фабрыка «Камунарка» — новае прадпрыемства, якое адкрыта ўсяго 4 месяцы назад. Ня гледзячы на гэта, яна ўжо вельмі забруджана.

Па ўсім двары—сужы, бруд, нячыстоты. З-за адсутнасьці складу, бочкі з патакай валяюцца на двары, вакол заўсёды поўна мух. Цукар і начыньне займаюць падсобнае памяшканьне і хаваюцца ў адкрытых бочках, пад якімі таксама носяцца шмат мух і мошак. Мяшкі з цукрам рваныя, цукар разносіцца нагамі па ўсёй падлозе. Рабочыя часта праліваюць на падлогу сіроп, які тут жа выбіраецца назад і ўтылізуецца.

Большасьць рабочых ня маюць спэц абутку, часта бываюць выпадкі апёкаў.

У карамельным цэху дзьверы і падлога пакрыты брудам, работніцы працуюць без касынак. У разьдзявальні—бруд, спецвопратка і верхняя вопратка рабочых знаходзяцца ў адной шафе. З 3-х памяшканьняў для душаў, якія зьяўляюцца для рабочых неабходнай зарадкай, адно закрыта, другое занята пад канцылярыю, а 3-цяе—пад мэдпункт.

На фабрыцы няма плявацельніц, яны ляжаць запакаванымі на складзе. У цэхах не хапае гатаванай вады, ручнікоў і мыла.

Такога антысанітарнага становішча на фабрыцы «Камунарка» далей цярпець нельга. Неабходна ў тэрміновым парадку зьнішчыць усе тыя агіднасьці, якія заўважаны брыгадай у часе рэйду.

Брыгада «Праўды» і «Зьвязды». Фрыдман, Вялічка, Пінхасік, Захаровскі, Балецкая, Цымэрман, Белагурцава, Шнітко і Вярмацкі.

УЗОР ЗЛАЧЫННЫХ АДНОСІН ДА БЫТАВЫХ ПАТРЭБ РАБОЧЫХ

БАРАКІ МЕНБУДУ ўяўляюць собой яркі ўзор антысанітарыі, злачынна нядбайных адносін адміністрацыі і прафарганізацыі да бытавых запатрабаваньняў рабочых. Калі ўваходу ў баракі заўсёды—вялікая пужа вады, а проста насупроць уваходу—звалка для сьмецьця.

У барачных пакоях на ложках валяюцца сапамяныя матрацы без коўдраў і іншых пасьцельных прыпад. У вокнах—склад прадуктаў і брудных рэчаў (боты, парчыкі і інш.).

На падлозе—кучы сьмецьця, пяску, акуркаў і інш. У пакоях надзвычайна душна, бо фортачак у вокнах няма. Самі вокны зроблены без пяцліц і не адкрываюцца.

Вада для піцьця стаіць у калідоры ў адкрытай бочцы без пакрышкі. Конаўкі каля бочкі няма і ваду ўсе п'юць... а крану. Ручнікоў і мыла сэзоньнікі не атрымліваюць.

Ня лепшы малюнак і ў мясцовай сталоўцы МЦРК. Ня гледзячы на тое, што сталовая абслугоўвае звыш 900 чалавек, абеды выдаюцца ў парадку самаабслугоўваньня. Заўсёды вялікія чаргі, лаянка і г. д.; на сталох і падлозе шмат бруду.

Начыньне для 900 абедаў мыюць у адным вядры, і без прасушкі наніроўваюць у сталоўку. Памяшканьне амаль ніколі ня мыецца. На ўсе заявы аб неабходнасьці правядзеньня санмінімуму, загадчык Гурвіч адказвае: «Вось пачакайце хутка пабудуем новую сталоўку ў лесе».

Мэдпункт займаецца толькі аказаньнем першай дапамогі, але зусім ня цікавіцца пытаньнямі прафілактыкі і паляпшэньня санітарна-бытавых умоў рабочых.

Культработа не наладжана: няма ні лекнутку, ні газэт.

Адміністрацыя і прафарганізацыі Менбуду зусім нічога не зрабілі, каб правесьці ў баракох санмінімум, паставіць на належную вышыню культурна-бытавое абслугоўваньне сэзоньнікаў. Мы патрабуем—зараз-жа ліквідаваць усе гэтыя агіднасьці, устанавіць на далейшы час штодзённы неаслабны кантроль за санітарным станам баракаў і сталовай для сэзоньнікаў Менбуду.

Брыгада «Праўды» і «Зьвязды»— Астроўскі, Гольдштэйн, Бацьвіньнік, Быхаўская, Барсук, Зайчык і Ліберштэйн.

Аздаравіць пасёлак „Камінтэрн"

У пасёлку «Камінтэрн» жыве 2.000 рабочых з заводаў імя Варашылава і «Бальшавік». Большасьць двароў знаходзіцца ў антысанітарным стане і ня мае нават сьмяцьцёвых ям.

Дзіцячая пляцоўка, знаходзіцца ў адным цесным пакоі і не адпавядае свайму прызначэньню. Праўленьне жаксу, замест таго, каб перадаць суседні пакой дзіцячай пляцоўцы, здало яго ў аренду.

На тэрыторыі пасёлку ёсьць крама, санітарны стан якой вельмі дрэнны усюды гразь і павуцінньне.

Пры жаксе няма санітарнай камісіі, якая-б сачыла за чыстатой.

На ўвесь пасёлак ёсьць толькі тэатры стулні, з прычыны чаго многім жыхарам прыходзіцца далёка ісьці за вадой.

Трэба неадкладна палепшыць бытавое абслугоўваньне рабочых жыхароў пасёлку «Камінтэрн».

Брыгада «Праўды» і «Зьвязды»— Нэйдпін, Крывашэін, Дрэйцэр, Шэхавіцкі, Каплан, Хургін і Кукес.

„Чырвоны тарфянік" датэрмінова выканаў сэзоннае заданьне

Здабыча торфу па БССР (у проц.)

18 жніўня	19 жніўня	20 жніўня
44,7	45,2	45,8

СТАНОВІШЧА З СУШКАЙ, УБОРКАЙ І ВЫВАЗКАЙ ТАРФЯНЫХ ЦАГЛІН З ПАЛЕЎ СЬЦІЛКІ ПАГРАЖАЮЧАЕ.

НА СЬМІЛАВІЦКІХ, ЦНЯНСКІХ І ІНШ. ТОРФАРАСПРАЦОЎКАХ НА ПАЛЕХ СЬЦІЛКІ ЛЯЖАЦЬ СОТНІ ТЫСЯЧ ЗАГАТОЎЛЕНЫХ ЦАГЛІН ТОРФУ, ЯКІЯ ПАТРАБУЮЦЬ БЕЗАДКЛАДНАЙ СУШКІ, УБОРКІ І ВЫВАЗКІ.

ПРАГРАМА СУШКІ ВЫКАНАНА УСЯГО ПРЫБЛІЗНА НА 30 ПРОЦ.

АДСЮЛЬ ВЫВАД, ШТО ЗАРАЗ СУШКА, УБОРКА І ВЫВАЗКА ЗДАБЫТАГА ТОРФУ ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА САМЫМІ АСНОЎНЫМІ ВУЧАСТКАМІ, НА ЯКІЯ ПАТРЭБНА КІНУЦЬ МАКСЫМУМ СІЛ ГАСПАДАРЧЫХ, ПАРТЫЙНЫХ І ПРАФСАЮЗНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ, НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЕ АСЛАБЛЯЮЧЫ ТЭМПАЎ ЗДАБЫЧЫ ТОРФУ.

ДЛЯ ХУТЧЭЙШАЙ ЗДАБЫЧЫ І АСАБЛІВА СУШКІ, УБОРКІ І ВЫВАЗКІ ТОРФУ ПАВІННЫ ЗНАЧНУЮ ДАПАМОГУ АКАЗАЦЬ ПРАМЫСЛОВЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ ШЛЯХАМ АРГАНІЗАЦЫІ МАСАВЫХ СУБОТНІКАЎ, ВЫКАРЫСТАНЬНЯ ВЫХОДНЫХ ДЗЁН НА ТОРФАРАСПРАЦОЎКАХ, ШТО АСАБЛІВА ПРАКТЫКУЕЦЦА ГОМЕЛЬШЧЫНАЙ.

ДАНЯСЕНЬНІ ПЕРАМОЖЦАЎ

ВІЦЕБСК, 24.

У ВЫНІКУ ШЫРОКА РАЗГОРНУТАГА ЎДАРНІЦТВА І САЦСПАБОРНІЦТВА, ЛІКВІДАЦЫІ АБЯЗЬЛІЧКІ І ЎРАЎНІЛАЎКІ, УВЯДЗЕНЬНЯ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ І ГАСПАДАРЧАГА РАЗРАХУНКУ, ЗАВОД «ЧЫРВОНЫ ТАРФЯНІК» ПЕРШЫМ У БССР 21 ЖНІЎНЯ НА 9 ДЗЁН РАНЕЙ ТЭРМІНУ ВЫКАНАЎ СЭЗОННЫ ПЛЯН ТОРФАЗДАБЫЧЫ.

ГОМЕЛЬ, 24.

ТОРФАЗАВОД «ДАВЫДАЎКА» ВЫКАНАЎ СЭЗОННАЕ ЗАДАНЬНЕ ПА МАШЫНА-ФАРМОВАЧНЫМ ТОРФЕ НА 117 ПРОЦ.

„НІ АДНАГО ЦЭНТНЭРА ЗБОЖЖА ПРЫВАТНІКУ"

РЭАЛІЗАЦЫЯ кантрактацыйных дагавароў— па-за ўвагай загатоўчых арганізацый

АФОРМІЦЬ УСЕ ДАГАВАРЫ

АРГАНІЗУЕМ ДАТЭРМІНОВУЮ ЗДАЧУ ПРАДУКЦЫІ

На працягу восені мінулага году і вясны бягучага сыстэмы сельска-гаспадарчай і спажывецкай кааперацыі БССР закантрактавалі ў калгасах і бядняцка-серадняцкіх гаспадарках вялізную колькасьць збожжа і інш. с.-г. прадукцыі, касьць збожжа і інш. с.-г. прадукцыі. Усялякія разважаньні, што з пашырэньнем калектывізацыі кантрактацыя губляе свой сэнс, зьяўляюцца палітычна-шкодныімі і павінны спаткаць рашучы адпор. Кантрактацыйныя дагаворы зьяўляюцца дакумантамі двухбаковых сацыялістычных абавязкаў паміж калгасамі і аднаасобным сэктарам вёскі з аднаго боку і дзяржавай—з другога боку, яны дапамагаюць ажыцьцяўленьню мерапрыемстваў партыі і ўлады па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Калгасы і бядняцка-серадняцкія гаспадаркі, якія закантрактавалі свае пасевы, павінны зараз паказаць прыклад свалячасовай і арганізаванай здачы дзяржаве сваёй прадукцыі.

Між тым, уступіўшы непасрэдна ў загатоўчую кампанію культур ураджаю 1931 году, большасьць раённых арганізацый БССР забылася аб рэалізацыі кантрактацыйных дагавораў, заключаных восенью 1930 г. і вясной бягучага году. Аб гэтым з усёй выразнасьцю сьведчыць той факт, што НА 15-Е ЖНІЎНЯ ПАСТУПЛЕНЬНЕ ЗБОЖЖА ПА КАНТРАКТАЦЫІ СКЛАДАЕ ЎСЯГО 3% ДА АГУЛЬНАЙ КОЛЬКАСЬЦІ ЗАГАТОЎЛЕНАГА ЗБОЖЖА. Гэта лічба больш чым нездавальняючая. Да гэтага часу па кантрактацыі павінна ўжо было паступіць НА-МЕНШ 50% агульнай колькасьці збожжа.

Гэты прарыў трэба неадкладна ліквідаваць. Раённыя арганізацыі павінны мабілізаваць усю масу кантрактантаў на выкананьне кантрактацыйных дагавароў. Дзяржава ўжо выканала свае абавязкі перад кантрактантамі, накіраваўшы вялізарную колькасьць крэдытаў і сродкаў вытворчасьці ў сельскую гаспадарку. Зараз калгасы і бядняцка-серадняцкія гаспадаркі павінны выканаць і свае абавязкі па заключаных з дзяржавай дагаворах, — здаць прадукцыю поўнасьцю і ва ўстаноўленыя тэрміны. Кампанія па рэалізацыі кантрактацыйных дагавароў павінна прайсьці пад лёзунгам «ЗА ВЫКАНАНЬНЕ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ КАНТРАКТАЦЫЙНЫХ ДАГАВАРОЎ У НАЙКАРАЦЕЙШЫЯ ТЭРМІНЫ».

Сыстэмы сельска-гаспадарчай і спажывецкай кааперацыі, якія заключалі кантрактацыйныя дагаворы з калгасамі і бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі, да гэтага часу не падрыхтавалісь да рэалізацыі гэтых дагавораў. Кантрактацыйныя кніжкі не разданы на рукі кантрактантам, сьпісы кантрактантаў ня складзены. У кніжках няма адзнак аб нормах здачы прадукцыі. Масава-растлумачальная работа сярод калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў аб значэньні свалячасовага выкананьня дагавораў амаль нідзе не разгорнута.

Кулацка-заможныя элемэнты вядуць шалёную агітацыю супроць выкананьня кантрактацыйных дагавораў, а раённыя арганізацыі ў радзе выпадкаў не даюць рашучага адпору кулацкай агітацыі, не мабілізуюць масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў на барацьбу з кулацтвам.

Патрэбен рашучы і карэнны пералом. Неабходна зараз-жа скласьці сьпісы ўсіх кантрактантаў па сельсаветах і вёсках з адначасовым устанаўленьнем і адзнакай як у сьпісах, так і ў кантрактацыйных кніжках, на падставе сярэдняй ураджайнасьці сельсаветаў — нормы здачы прадукцыі. КАНТРАКТАЦЫЙНЫЯ КНІЖКІ ПАВІННЫ БЫЦЬ НА РУКАХ У КАНТРАКТАНТАЎ, АПОШНІЯ ПАВІННЫ ДАКЛАДНА ВЕДАЦЬ КОЛЬКАСЬЦЬ, ТЭРМІНЫ І ПУНКТЫ ЗДАЧЫ ПРАДУКЦЫІ.

Сьпісы кантрактантаў з нормамі здачы павінны быць у кожным райкаапсаюзе ці райспажыўсаюзе (у залежнасьці ад таго, якая кааперацыйная сыстэма ў раёне праводзіць загатоўкі), сельсаветах, у сельупаўнаважанага па загатоўках і намісіі сэдзейнасьці загатоўкам.

Усю гэту работу трэба правесьці па ўсіх культурах АДНАЧАСОВА. Нельга дапусьціць, каб кампанія па рэалізацыі кантрактацыйных дагавораў праводзілася па кожнай культуры паасобку.

За практычнае ажыцьцяўленьне задачы па рэалізацыі кантрактацыйных дагавораў трэба ўзяцца неадкладна і пабаяному, бальшавіцкімі тэмпамі, арганізуючы ўсю работу на аснове сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж раёнамі, калгасамі, вёскамі і населішчамі.

Ал. Красоўскі.

Злачынная цяганіна з прыёмкай чырвонага абозу

Нядаўна ў Менск прыбылі чырвоныя абозы са збожжам, арганізаваныя прыгарадныімі калгасамі. Сустрэча абозаў была даручана работніку Саюзхлеба тав. РУБЕНЧЫКУ. Але апошні нічога не зрабіў для арганізацыі прыёмкі збожжа. Калгасьнікі прымушаны былі езьдзіць з аднаго складу ў другі і не маглі дабіцца дакладнага адказу, дзе ў іх прымуць збожжа. З пляцу Камуны іх накіравалі на Грушаўскую вуліцу, адтуль у кантору Саюзхлеба, потым на таварную станцыю і г. д. Калгасьнікі былі абураны такой цяганінай.

Трэба прыцягнуць да адказнасьці Рубенчыка, які дапусьціў агідную цяганіну з прыёмкай збожжа чырвоных абозаў. Да рэчы, трэба дадаць, што Рубенчык—былы гандляр.

ЛЕВІН.

На аснове сацспаборніцтва выканалі плян загатовак

МАГІЛЕЎ (БЕЛТА). Калгасьнікі і аднаасобныя гаспадаркі Чарназемаўскага сельсавету 21-га жніўня арганізавалі вялікі чырвоны абоз са збожжам і іншай прадукцыяй. Здана 83 цэнт. збожжа, 33 — сена, 50 — бульбы. Пашкаўскі сельсавет, на аснове спаборніцтва паміж калгасамі і вёскамі, поўнасьцю выканаў плян загатовак сена. Здана 370 цэнт.

НАСУСТРАЧ НАВУЧАЛЬНАМУ ГОДУ

Магілеў— У ГЛЫБОКІМ ТЫЛЕ ПАДРЫХТОЎКІ

ПАРТЫЙНАЯ НАРАДА

ПА ПЫТАНЬНЯХ ПАДРЫХТОЎКІ ДА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ

Гэтымі днямі ў Магілеве адбылася міжраённая партыйная нарада па пытаньнях падрыхтоўкі да новага навучальнага году.

На нарадзе прымалі ўдзел прадстаўнікі райкомаў КП(б)Б і аддзетніцкі актыў 18 раёнаў. Былі заслуханы справаздачныя даклады інспэктараў асьветы: МАГІЛЕЎСКАГА, РАГАЧОЎСКАГА, ДУБРОВЕНСКАГА І АРШАНСКАГА раёнаў. З пашыраным дакладам аб задачах новага навучальнага году выступіў прадстаўнік ад Нарнамасьветы тав. БЯЛУГА, які асабліва заваструў увагу ўсёй партыйнай нарады на неабходнасьці шырокага палітэхнічнага навучаньня ў бягучым годзе.

— Мы прышлі да таго парыву—гаво рыць т. Бялуга,—калі навучальная справа пастаўлена на асаблівую вышыню. Гэтага вымагае шпаркі рост сацыялістычнага будаўніцтва.

Аднак, шмат раёнаў не зразумелі гэтага. Яны лічэ праводзяць сваю праца па-старому, не разумеючы таго, што перабудова сельскай гаспадаркі на сацыялістычны лад патрабуе карэннай зьмены ўсёй работы па асьветніцкай галіне.

Выступаючыя прадстаўнікі паасобных раёнаў падкрэсьлівалі, што па некаторых раёнах падрыхтоўчая работа праводзіцца дрэнна.

РВК, райкомы партыі не ўзяліся яшчэ па-баявому за ліквідацыю прарываў у гэтай рабоце. Так, па МАГІЛЕЎСКІМ раёне падрыхтоўка пачалася да новага навучальнага году толькі ў другой палове жніўня, а таму ў 11 школах рамонт не пачынаўся. 35 проц. школ не забясьпечаны апаламі. Не хапае 47 настаўнікаў. Па 10 сельсаветах не праведзен улік няпісьменных і малапісьменных. Большая частка будаўніцтва новых школ у тэрмін ня будзе закончана. Да складаньня адзінага культпляну яшчэ не прыступілі.

Ня лепшая справа і ў РАГАЧОЎСКІМ раёне. 16 школ не рамантуюцца, аб гэтым ніхто не клапоціцца. Не хапае 57 настаўнікаў. У ДУБРОВЕНСКІМ раёне яшчэ ў 1929 г. распачата будаўніцтва 8 школ, але скончаны будуць толькі 3. ЧЫРВОНА-СЛАБОДЗКАЯ школа будуецца 5 год.

Асабліва дрэнна стаіць справа з абсталяваньнем школ. У КАСЬЦЮКОВІЦКІМ, КЛІЧАЎСКІМ І ВЫХАЎСКІМ раёнах. Там яшчэ толькі думаюць (?!) распачынаць падрыхтоўку да новага навучальнага году.

Па гор. МАГІЛЕВЕ пагражаючае становішча з забясьпячэньнем слухачоў разных навучальных устаноў інтэрнатамі. На сёньнішні дзень не хапае памяшканьняў больш як на 600 асоб. Намечаныя да будаўніцтва рад новых інтэрнатаў свалячасова скончаны НЯ БУДУЦЬ. 5 школ у горадзе не рамантуюцца. Гарадзкі інспэктар асьветы тав. АЛЬХІМОВІЧ кажа: «Рамонт школ не праводзіцца таму, што няма загадчыкаў школ».

Пагражаючым трэба лічыць становішча з камплектаваньнем розных сярэдніх навучальных устаноў слухачамі і падкадрамі. Паводле пляну ў пэдтэхнікум трэба прыняць 240 асоб, а заяў паступіла толькі 45. У пэдінстытут патрэбна прыняць 60 асоб, а заяў падана 2.

Тыя раёны, якія распачалі падрыхтоўку да новага навучальнага году свалячасова, там справа стаіць значна лепш.

АРШАНСКІ раён, які вёў падрыхтоўку ПА-ЎДАРНАМУ, скарыстоўваючы ўсе магчымасьці, якія толькі былі ў раёне, сустрэкае навучальны год ЗУСІМ ПАДРЫХТАВАНЫМ. Школы адрамантаваны і пабудаваны.

Горацкі раён распачаў падрыхтоўку ў мае месяцы. У выніку школы падрыхтаваны, складзен адзіны культплян, па ўсім раёне праведзен дакладны ўлік няпісьменных і малапісьменных.

Партыйная нарада зьвярнула асаблівую ўвагу на тое, што некаторыя раёны вельмі дрэнна вдносяцца да забясьпячэньня настаўнікаў прадуктамі і прамысловымі таварамі. (Дубровенскі, Чырвонапольскі і Горацкі).

Камсамольскія арганізацыі узятых на сябе абавязкаў, як шэфа ўсвагульнага навучаньня, ня выканалі.

Нарада адзначыла, што раённая газэта «Камунар Магілеўшчыны» зусім мала ўдзяляе і ўдзяляе ўсягі пытаньням падрыхтоўкі да навучальнага году.

Прадстаўнікі паасобных раёнаў абавязаліся па-ўдарнаму весьці барацьбу з пятуніствам, дэзэртырствам на асьветніцкім фронце.

ТАЛАТАЙ, СКАВАРОДКА.

НА ВОДНЫХ ШЛЯХОХ

ДЭКАДНІК САМАПРАВЕРКІ СКОНЧЫЎСЯ БАРАЦЬБУ ПРАЦЯГВАЦЬ

за ўдарнае правядзеньне асеньня-зімовых перавозак

Замацаваць пералом

Абвешчаны дэкаднік праверкі і самаправеркі гатоўнасьці рэчнага транспарту БССР да асеньня-зімовых перавозак ператварыўся у масавую гаспадарча-палітычную кампанію па мабілізацыі шырокіх мас воднікаў на ліквідацыю прарываў, на падняцьце працдысцыпліны, мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў, прыцягненьне грузаў на ваду, пераход на гаспадарчы разрахунак і г. д.

У часе дэкадніку па Дняпра-Дзьвінскім басэйне на мясцох працавалі 63 брыгады. У выніку дэкадніка ўзьнялася новая хваля энтузіязму рабочых воднікаў, узрасла актыўнасьць, павялічыўся прыток рабочых у партыю, значна ўзрасьлі рады ўдарнікаў за лік лепшых рабочых і г. д.

На ўсіх суднах і прыстанях, арганізаваны кантрольныя пункты для праверкі выкананьня узятых на сябе абавязкаў па сустрэчным трансфінплане, эканоміі апалу, змазачных матар'ялаў, на свалячасовай дастаўцы грузаў, зьнижэньні сабекошту і г. д. Арганізавана 17 таварыскіх судоў па барацьбе з парушэньнямі працдысцыпліны.

Дэкаднік праверкі і самаправеркі выявіў, што рэчны транспарт БССР да асеньня-зімовых перавозак яшчэ не падрыхтаваны. Гаспадаркі і па сёньнішні дзень яшчэ ня здолелі нападзіць выразнага апэрацыйнага кіраўніцтва па ўсіх галінах работы воднага транспарту. Рабочая сіла і на сёньнішні дзень расстаўлена няправільна. Флёт выкарыстоўваецца ня з поўнай нагрузкай. Пагрузачна-разгрузачныя работы не забясьпечаны выстарчальнай колькасьцю інвэнтару і рабочай сілы, а гэта ў сваю чаргу стварае пробкі (Гомель, Віцебск, і Жлобін).

Гаспадарчыя арганізацыі вядуць зусім слабую барацьбу за плянавую падачу грузу. У гэтым напрамку існуе поўны самацёк.

Вытворчыя нарады да гэтага часу яшчэ не разгарнулі работы ў напрамку выяўленьня і зьнішчэньня недахопаў у рабоце паасобных суднаў, каманд, прыстаняй і г. д.

Прафэсыянальныя арганізацыі за многіх месяцох не перабудавалі сваёй работы ў адпаведнасьці з новымі задачамі, не нападзілі культмасавай работы, ня ўключыліся ў барацьбу за ўладаньне тэхнікай, слаба кіруюць ударніцтвам і сацспаборніцтвам.

АДСУТНАСЬЦЬ ШТОДЗЕННАГА АПЭРАЦЫЙНАГА КІРАЎНІЦТВА, ЗАНЯПАД ПРАФСЫЯНАЛЬНАЙ РАБОТЫ, СЛАБАЯ РАБОТА ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ, ПОЎНЫ САМАЦЁК У ПЛЯНАВАНЬНІ ПЕРАВОЗАК, НЯПОЎНАЕ ВЫКАРЫСТАНЬНЕ ХАДАВОГА ЧАСУ І ТЭХНІЧНАЙ МАГУТНАСЬЦІ ФЛЁТУ—УСЁ ГЭТА ЗЬЯЎЛЯЛАСЯ ГАЛОЎНЫМІ ПРЫЧЫНАМІ НЕВЫКАНАНЬНЯ ТРАНСФІНПЛЯНУ ПЕРШАГА ПАЎГОДЗЬДЗЯ.

За пракўленьне правага апартунізму на практыцы ў прафэсыянальнай рабоце райкамвод распусьціў 4 судпрафкомы і 2 мясцкомы. Распушчаныя судкомы і мясцкомы на працягу доўгага часу бязьдзейнічалі, рабочую масу не мабілізавалі на выкананьне трансфінпляну, ударніцкім рухам не кіравалі, яны пляліся ў хвасьце адсталых настроеў. За п'яцігадзіны, недысцыплінаванасьць, безгаспадарчасьць, хвасьцізм і г. д. зьняты з работы 2 начальнікі прыстаняй і 4 камандзіры суднаў.

У часе дэкадніка партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі рэчнага транспарту дабіліся некаторага пералому. Гэты пералом павінен быць замацаваны і накіраваны на далейшае пасьпяховае выкананьне і перавыкананьне пляну асеньняй навігацыі. Неабходна зараз-жа разгарнуць работу вытворчых нарад. Яны павінны стаць сапраўдным штодзённым штабам новых мэтадаў работы. Партыйныя, прафэсыянальныя арганізацыі павінны рашуча перабудаваць сваю работу «тварам да вытворчасьці», да сапраўднага культбытавога абслугоўваньня рабочых воднікаў і г. д.

Забясьпечыць пасьпяховую работу гідратэхнічных зышукальных атрадаў

Гідра-тэхнічныя вышукальныя партыі Дняпра-Дзьвінскага басэйну ў сувязі з прапрацоўкай прамовы тав. Сталіна ўзялі на сябе рад канкрэтных абавязкаў па найхутчэйшым правядзеньні работы па зьнижэньні сабекошту і г. д.

Пятая вышукальная партыя абвясьціла сабе ўдарнай і ўзяла на сябе наступныя абавязкі: скончыць работу на адзін месяц раней вызначанага плянам тэрміну, зьнізіць сабекошт работ на 40 проц., змагацца за лепшую якасьць работ, узмацніць барацьбу з гультаямі і г. д. Апрача гэтага, пятая вышукальная партыя ўжо скончыла заключэньне дагавораў на сацыялістычнае спаборніцтва паміж атрадамі, асобнымі рабочымі і тэхнарэсурсамі.

Рабочыя і тэхнарэсурсы пятай вышукальнай групы, выклікалі на сацспаборніцтва першую і чацьвёртую гідра-тэхнічныя групы па наступных канкрэтных аб'ектах: усе віды работ—рабіць з разьлікі 8-мігадзіннага рабочага дня з поўнай нагрузкай, дабіцца зьнижэньня сабекошту на 40 проц., зьнішчыць нявытворчыя страты рабочага часу і грошай, дабіцца 100 проц. ахопу рабочых тэхнічнага пэрсаналу сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам і г. д.

Усе ўзятыя на сябе канкрэтныя абавязкі па выкананьні і перавыкананьні пляну гідра-тэхнічныя вышукальныя партыі змогуць поўнасьцю рэалізаваць у тым выпадку, калі з боку будсэктару Дняпра-Дзьвінскага будаўніцтва будзе наладжана жывое кіраўніцтва работамі, поўнае забясьпячэньне сродкамі, неабходным інструментам, спэцвопраткай, спэцлітаратурай і г. д.

ЭНГЕ.

Змагацца за выкананьне сустрэчных

Дэкаднік праверкі і самаправеркі падрыхтоўкі рэчнага транспарту да асеньніх перавозак добра быў праведзен па Гомельскай прыстані, якая абслугоўвае раку Сож. Рабочыя Гомельскіх судна-рамонтных майстэрань на агульным сходзе пастанавілі ў час дэкадніку адпрацаваць выходны дзень для пабудовы пакгаўзаў і пачынкі інвэнтару, неабходнага для асеньніх перавозак. Рабочыя грузчыкі ў сваю чаргу ўзялі на сябе абавязак і ўжо прыступілі да канкрэтнай падрыхтоўкі ўсіх чорных работ для пабудовы пакгаўзу.

На ўсіх суднах арганізаваны тройкі і кантрольныя рабкораўскія пасты. Ажыцьцёлена работа вытворчых нарад, а ў тых месцох, дзе не існавалі вытворчыя нарады, апошнія зноў арганізаваны. Паміж суднамі і камандамі заключаны сацыялістычныя дагаворы. Рабочыя і служачыя суднаў у колькасьці 150 чал., замацавалі сябе да канца пяцігодкі за рэчным транспартам.

Каманда параходу «Чырвоная зорка» ў часе абгаварэньня трансфінпляну выкінула свой сустрэчны трансфінплян па пасажыра-перавозках на 9,4 проц., па грузах вялікай хуткасьці на 15 проц. па зьнижэньні сабекошту і накладных выдатках на 50 проц.

Каманда параходу «Ак. Забалотны» выкінула сустрэчны трансфінплян на 10 проц.

Фашысцкія турэмшчыкі ў саюзе з прафэсыянальнымі бандытамі ФІЗЫЧНА ЗЬНІШЧАЮЦЬ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ

За крывавую расправу над рэвалюцыянэрамі бандыты і зладзеі атрымліваюць свабоду і ўрадавыя пасады

Галадоўка палітзьняволеных у Варшаве і Львове

ВІЛЬНЯ, 24. (Наш кар.). Зараз, у увязі з увядзеньнем новага фашысцка-паліцэйскага турэмнага рэгляменту, няма таго дня, каб у тэй або іншай турме фашысцкай Польшчы не адбывалася галадоўка, каб не адбывалася крывавая расправа акупантаў над рэвалюцыйнымі рабочымі і селянамі. Для дасягненьня сваёй мэты — фізычнага зьнішчэньня рэвалюцыйных барацьбітоў, фашысцкая ўлада ня спыняецца ні перад чым. Катаваньні, правакацыя, карцэры, сьмярыцельныя рубашкі, штучнае барбарскае кармленьне ў часе галадовак, забойствы — усё пушчана ў рук, абы толькі разьбіць, дэмаралізаваць рэвалюцыянэраў у турмах, зрабіць з іх «чырвоныя» трупы. **Для гэтай-жа мэты паміж фашысцкай уладай і прафэсыянальнымі бандытамі, зладзеямі заключан саюз, на падставе якога адкіды грамадзтва, дэмаралізаваныя рэнэгаты, у барацьбе супроць рэвалюцыйных рабочых і селян абавязваюцца «быць правай рукой гэтай улады», за што атрымліваюць як харчовую ўзнагароду, гарэлку, так і дараваньне злачынстваў і розныя ўрадавыя пасады.** Адным словам, супроць палоньнікаў капіталу выступае аб'яднаны фронт прадстаўнікоў фашысцкай улады і бандытаў.

Таму ня дзіва, што адбываюцца такія жудасныя сцэны, як пагалоўнае зьбіваньне, катаваньне і забойствы палітзьняволеных, таму ня дзіва, што перапоўнены шпіталі пакалечанымі таварышамі пасьля галадовак у Лукішках, а ў Горадні дык некалькі нашых таварышоў задушана. Разьюшаны фашызм, п'яны ад рабочай крыві, «неистовствует».

Крывавы ланцуг з Зах. Беларусі цягнецца ў турмы карэннай Польшчы і Зах. Украіны. **21-га жніўня**, як падае фашысцкая прэса, **уведзен паліцэйскі закон ва ўсіх Варшаўскіх турмах і на Брыгідках у Львове (Зах. Украіна).** Палітычныя зьняволеныя гэтых турмаў зраўнаны з крымінальнымі, пазбаўлены ўсіх тых прывілей, якія былі здабыты ўпартай шматгадовай барацьбой на працягу цэлых год. У знак пратэсту палітзьняволеныя варшаўскіх турмаў арганізавалі дэманстрацыю. **Палітзьняволеныя-ж сьледчай турмы Павіяк абвясьцілі галадоўку.**

У сувязі з галадоўкаю **ў Варшаве перад будынкам турмы адбываюцца бязупынныя баявыя дэманстрацыі пратэсту ў абарону палітзьняволеных.** Варшаўская паліцыя мабілізавана і прыведзена ў баявую гатоўнасьць. Турмы ахоўваюцца бранявікамі з кулямётамі.

У Львове перад турмою і перад будынкамі суда адбыліся бурныя дэманстрацыі пратэсту, у часе якіх здарыліся крывавыя сутычкі паміж дэманстрантамі і паліцыяй. Па ўсім горадзе былі раскіданы адозвы МОПР'у ў абарону палітзьняволеных. На тэлеграфных слупох і правадох былі вывешаны чырвоныя сьцягі з лёзунгамі: «Прэч фашысцкі турэмны закон», «Прэч белы тэрор», «Прэч крывавую дыктатуру Пілсудскага».

У сувязі з рабочымі дэманстрацыямі **ў Варшаве адбываюцца бязупынныя вобыскі і арышты.** Паводле ўрадавага афіцыёзу — «Газэты Польскай», на працягу аднаго толькі дня **ў Варшаве арыштавана звыш 100 чалавек — дэманстрантаў.**

Лавінай падымаецца грозная хваля пратэсту. Пралетарыят Польшчы паўстае на дапамогу сваім катаваным братом. Пралетары СССР і ўсяго сьвету, дапамажэце.

Пралетары Нямеччыны і ўсяго сьвету, пратэстуйце супроць крывавага тэрору ў турмах фашысцкай Польшчы

АДОЗВА РАБОЧЫХ ГОМЕЛЬСКАГА ЗАВОДУ ІМЯ ЛАНЦУЦКАГА

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Польскі фашызм, тыя супярэчнасьці, якія заложаны ў капіталістычнай сыстэме, глыбокі эканамічны крызіс імкнецца супольна з сацыял - і нацыянал-фашызмам вырашыць шляхам узмацненьня крывавага тэрору як у самой Польшчы, так асабліва на акупаваных Зах. Беларусі і Зах. Украіне, шляхам наступленьня на рабочую клясу, шляхам падрыхтоўкі ўзброенага нападу на СССР. Асабліва шалее. ў апошнія часы белы тэрор у турмах, дзе фашысцкая ўлада паваяла атаку, каб фізычна зьнішчыць рэвалюцыянэраў—гэтых пешых прадстаўнікоў рабочай клясы і працоўнага сялянства, што гераічна змагаюцца супроць фашысцкай дыктатуры.

З нашай памяці яшчэ не зглядзіўся час панаваньня белапольскіх акупантаў на тэрыторыі савецкай Беларусі.

Мы добра памятаем усе тыя зьдзекі, зьверствы, якія тварыліся гэтымі белабандытамі над працоўнымі масамі свабоднай зараз БССР. Мы самі наглядна ўбачылі і добра адчулі на сваёй сьпіне іхнюю «цывілізацыю». Але-ж рабочая кляса, пад кіраўніцтвам камуністычнай ленінскай партыі, у часе грамадзянскай вайны сказала сваё слова і белапольскія банды раз назаўсёды былі вымецены з нашай тэрыторыі.

І ў той час, калі мы, пад непахісным кіраўніцтвам сталёвай ленінскай камуністычнай партыі, пасьпяхова будуем сацыялістычную гаспадарку, калі мы пановаму будуем сваё культурна - бытавое жыцьцё, разгарнуўшы нябачныя тэмпы ва ўсіх галінах сацбудаўніцтва і ўсё тое, што мы намецілі будаваць у пяць год будуем у 3 і 2 з пал. гады,—працоўныя масы Зах. Беларусі і Зах. Украіны зруйнаваны капіталістамі і жабрацтва.

МЫ ПОЎНАСЬЦЮ ЛІКВІДАВАЛІ БЕСПРАЦОЎЕ. ЗАМЕСТ 8 ГАДЗІН ПРАЦУЕМ 7. ПРАЗ КОЖНЫЯ 4 ДНІ РАБОТЫ АДПАЧЫВАЕМ. МЫ СА СВАЙГО АСЯРОДЗІШЧА РЫХТУЕМ СОТНІ ТЫСЯЧ РАБОЧЫХ НА ІНЖЫНЭРАЎ, ТЭХНІКАЎ І РАД ІНШЫХ СПЭЦЫЯЛІСТАЎ, ЯКІЯ НАМ ЗАРАЗ НАДЗВЫЧАЙ ПАТРЭБНЫ.

Мы бязупынна працуем над паляпшэньнем нашага культурна - бытавога жыцьця, пабудовай раду новых клюбаў і добрых будынкаў для жыцьця, нашы дзеці культурна выхоўваюцца праз дзіцячыя ясьлі, сады і г. д.

Усіх гэтых посьпехаў мы дасягнулі дзякуючы адзіна - правільнай ленінскай лініі камуністычнай партыі ў ажыцьцяўленьні нацыянальнай палітыкі. Усе нацыянальныя меншасьці разам з усёй рабочай клясай савецкай Беларусі і ўсяго Савецкага Саюзу будуюць роўнаправна сваё жыцьцё.

І ВОСЬ У ГЭТЫ САМЫ ЧАС МА БАЧЫМ, ШТО СОТНІ ТЫСЯЧ СЕМ'ЯЎ РАБОЧЫХ І ІХ ДЗЕЦІ Ў ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ ГАЛАДАЮЦЬ. У ГЭТЫ ЧАС МЫ БАЧЫМ І ЧУЕМ КОЖНЫ ДЗЕНЬ СТОГНЫ СОЦЕНЬ ТЫСЯЧ БЕСПРАЦОЎНЫХ І КАТАВАНЬНЕ ДЗЕСЯТКАЎ ТЫСЯЧ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ, КІНУТЫХ У ТУРМЫ, ЯКІЯ ПА НАШЫМ ПРЫКЛАДЗЕ ІМКНУЦЦА БУДАВАЦЬ СВАЁ ЎЛАСНАЕ ЖЫЦЬЦЁ БЕЗ БУРЖУАЗНЫХ ПАРАЗЫТАЎ. І на пратэст рабочай клясы і працоўнага сялянства Зах. Беларусі і Зах. Украіны супроць гэтай буржуазнай эксплёатацыі польскі фашызм адказвае крывавымі экспэдыцыямі, высяленьнем рэвалюцыйных элемэнтаў у Пазнаншчыну і падрыхтоўкай вайны супроць бацькаўшчыны сусьветнага пралетарыяту—СССР.

Таварышы рабочыя Нямеччыны! Мы зьвяртаемся да вас з заклікам сумесна з намі ўзьняць свой голас пратэсту супроць нячуванага белафашысцкага тэрору ў Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіне.

НЯЎЖО ВЫ ПРЫ ТАКІХ НЯБАЧАНЫХ ЗЬДЗЕКАХ І ЗЬВЕРСТВАХ, ЯКІЯ АДБЫВАЮЦЦА Ў БЕЛАСТОЦКАЙ, ПІНСКАЙ, ГОРАДЗЕНСКАЙ, ЛУКІСКАЙ І ІНШЫХ ТУРМАХ ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ МОЖАЦЕ ЗАСТАВАЦЦА ТОЛЬКІ БЯЗУДЗЕЛЬНЫМІ НАГЛЯДАЛЬНІКАМІ? НЯЎЖО ВЫ МОЖАЦЕ МАЎЧАЦЬ, КАЛІ ПА НЕКАЛЬКІ ТЫДНЯЎ КАТУЮЦЬ НАШЫХ БРАТОЎ, КАЛІ ЖАЛЕЗНЫМІ КРУКАМІ РАЗРЫВАЮЦЬ РТЫ Ў ЧАСЕ ШТУЧНАГА КАРМЛЕНЬНЯ, КАЛІ ВЕШАЮЦЬ МОЛАДЗЬ ЗА ТОЕ, ШТО БЕЗ ДАЗВОЛУ АРГАНІЗАВАЛА СПЭКТАКЛЬ? Так зрабілі ў вёсцы Ваўкавічах З ТАВ. МАРЧЫКАМ, ЯКОГА ДЗФЭНЗЫВА ДА ПАЎСЬМЕРЦІ ЗЬБІТАГА ПАВЕСІЛА. НЯЎЖО ВЫ АД ТАКІХ ЖАХАЎ, АД ЯКІХ КРОЎ СТЫНЕ Ў ЖЫЛАХ, ЗАСТАНЕЦЕСЯ Ў БАКУ?

Мы заклікаем вас узьняць свой голас пратэсту і патрабаваць вызваленьня палітзьняволеных і зьнішчэньня зьверскіх катаваньняў, якіх ня ведае гісторыя.

МЫ, 2.500-НЫ КАЛЕКТЫЎ РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ ЗАВОДУ ІМЯ ЛАНЦУЦКАГА Ў ЗНАК САЛІДАРНАСЬЦІ З ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫМІ, УНОСІМ У ФОНД ЗІМОВАЙ ДАПАМОГІ ІМ І ІХ СЕМ'ЯМ ½% МЕСЯЧНАГА СВАЙГО ЗАРАБОТКУ. АДНАЧАСОВА, УСЕ ЯК АДЗІН, УСТУПАЕМ У РАДЫ МОПР'у.

У адказ на фашысцкі крывавы тэрор пілсудчыкаў мы яшчэ з большай упартасьцю, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, будзем рашуча змагацца за выкананьне ўсіх задач, што стаяць перад намі, за ўзмацненьне інтэрнацыянальнай сувязі і абароназдольнасьці нашай краіны, якая зьяўляецца ўдарнай брыгадай сусьветнага пралетарыяту.

Прэч белы тэрор фашысцкай дыктатуры Пілсудзкага!

Няхай жыве кампартыя Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны!

Няхай жыве сусьветны пралетарыят і мацнее яго рэвалюцыйны рух!

(Пад рэзалюцыяй ідуць 350 подпісаў).

Яшчэ адна ахвяра белага тэрору

Кожны дзень з катаржных турмаў фашысцкай Польшчы прыходзяць жудасныя весткі аб **НОВЫХ АХВЯРАХ**, ЯКІХ ВЫРЫВАЮЦЬ З РАДОЎ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ АЗЬВЯРЭЛЫЯ ТУРЭМНЫЯ КАТЫ.

ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫЯ БЕЛАСТОЦКАЙ КАТАРЖНАЙ ТУРМЫ ў адозьве да рабочых, сялян і салдат Польшчы, і ўсяго сьвету, пішуць:

«ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ! ПАСЬЛЯ ГАДАВОГА ЗНАХОДЖАНЬНЯ Ў ТУРМЕ, У ЦЯЖКІХ МУКАХ ПАМЁР 19-ГАДОВЫ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫ ТАВ. МІКАЛАЙ ДЭМБОВІЧ, ЯКОГА ПРЫ АРЫШЦЕ СТРАШЭННА ЗЬБІЛІ Ў ДЭФЭНЗЫВЕ, ЗЛАМАЎШЫ ЯМУ СКІВІЦУ.

Доўгі сьпіс ахвяр белага тэрору папаўнілася яшчэ адным маладым жыцьцём барацьбіта — прадстаўніка рэвалюцыйнага сялянства.

Калі палітзьняволеныя ўшанавалі памяць памёршага змагара, ахвяры белага тэрору, фашысцкая турэмная адміністрацыя ЗБІЛА ЦЭЛЫ РАД ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ».

Хваля пратэстаў на заводах Гомелю

ГОМЕЛЬ, 22. (БЕЛТА). Весткі аб жахлівых катаваньнях і масавых забойствах у турмах фашысцкай Польшчы выклікалі моцнае абурэньне ў рабочых масах Гомелю. На прадпрыемствах стыхійна зьбіраюцца мітынгі пратэсту. На большасьці прадпрыемстваў Гомелю рабочыя адлічылі ў фонд дапамогі палітзьняволеным 2 проц. месячнай зарплаты.

РАБОЧЫЯ ЗАВОДУ ІМЯ ЛАНЦУЦКАГА ПАСТАНАВІЛІ ЗЬВЯРНУЦЦА З ЛІСТОМ ДА РАБОЧЫХ НЯМЕЧЧЫНЫ З ПРАПАНОВАЮ ЎЗЬНЯЦЬ СВОЙ ГОЛАС ПРАТЭСТУ СУПРОЦЬ КАТАВАНЬНЯ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ У ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Год выданьня—XV
№ 239 (4135)
Аўторак 25 жніўня 1931
Цана нумара 5 кап.
выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

Зьвязда

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І ТЭЛЕФОНЫ
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.
Тэлефоны
(рэдактар—4-27.)—сакратар—10-74, партсэктар—13-80, отраслев.—13-80, сел. хаз.—6-19, жасц. інфарм.—6-19, замест. інфарм.—6-19, начны рэдактар—6-42, міжгародняй інфармацыі—10-74, канторыя—7-31, адд. абвесткі—7-31.

„Малыгін" паказаў рэкордную хуткасьць палярнага плаваньня

„Самае цікавае арктычнае падарожжа"—гаворыць Нобіле

АРХАНГЕЛЬСК, 21. Сёньня ў полудзень «Малыгін» увайшоў у Паўночную Дзвіну і ў першай гадзіне дня прышвартаваўся ля галоўнай прыстані Архангельска.

Пасьля месячнага плаваньня з зьдзіўленьнем пазіраем на зялёныя дровы. Спадарожнікі, якія звыклися зімішнёю ледзяных пустынь Арктыкі, выходзяць на шумную прыстань.

Першы пасажырскі рэйс у Арктыку закончан. Мы зноў бачым рух на вуліцах, зноў чытаем газэты. Толькі скуры мядзьвежэй на вантах ледакола могуць напомніць туманы Палярнага акіяну, пэлест плывучых ледзяных астравоў.

Начальнікам экспэдыцыі ў часе гэтага паходу ледакола прасочана і вывучана вялікая мель, якая знаходзіцца на ўсход ад вострава Ньютона. З гэтага часу караблі могуць рабіць гэты шлях зусім бясьпечна. У Паўднёва-заходняй частцы вострава Карла-Аляксандра адкрыты тры востравы, аб існаваньні якіх дагэтуль ня ведалі. Караблі ніколі не праходзілі так блізка ад вострава Карла-Аляксандра.

Лёгка і хутка, у трыццаць два дні, «Малыгін» абышоў усю зямлю Францы Іосіфа. Ня гледзячы на густыя туманы, цяжкія і няпрыступныя ільды, «Малыгін» вярнуўся ў Архангельск, пабіўшы рэкордны тэрмін хуткасьці палярнага плаваньня.

Нобіле ў канцы паходу сказаў, што «Малыгін» бліскуча правёў падарожжа і з незвычайнай лёгкасьцю зрабіў шлях, які так нядаўна самыя смелыя спадарожнікі праходзілі з вялікімі цяжкасьцямі. Гэтым посьпехам падарожжа абавязана ўмеламу кіраўніцтву савецкіх вучоных і выпрабаванаму капітану Чарткову, які ўнікнуў грозных небясьпекі, што таіцца ў Арктыцы пры кожным руху.

* * *

Экспэдыцыя, арганізаваная «Інтурыстам» на ледаколе «Малыгін», скончылася. 23 жніўня ўсе ўдзельнікі экспэдыцыі прыбылі з Архангельску ў Маскву. Экспэдыцыяй адкрыты 4 новых востравы і «закрыт» няіснуючы востраў Гармсорта. Такім чынам, выпраўлена карта. Сабраны матар'ялы па гідралёгіі і мэтэралёгіі. Дасягнута шырыня ў 81 градус 49 мінут. Паказам работы зімоўшчыкаў у бухце Ціхай, на Матачкінай кулі, а таксама самаедзкага савету на Бядужай Губе прадэманстраваны чужаземным турыстам культурныя дасягненьні краіны, у якой будуецца сацыялізм.

Адстаўка ўраду Макданальда

ЛЁНДАН, 24. На начным пасяджэньні габінэту пасьля вострых спрэчак пейбарысцкі ўрад пастанавіў падаць у адстаўку. Новы габінэт даручана будзе фармаваць лідэру кансэрватараў Бальдвіну.

У апошнія дні разгалосьсі сярод членаў лейбарысцкага ўраду дасягнулі надзвычайнай вострасьці. Новая схэма Макданальда-Сноўдэна лячэньня крызісу зьмяшчала акрамя вядомых ужо мер—павышэньне ставак падаходнага падатку і павышэньне падатку на тытун і піва, павышэньне ўкосных падаткаў, таксама і зьніжэньне дапамог па беспрацоўі на 9 проц. Прыняцьце гэтай меры магло пацягнуць за сабой адстаўку 9 міністраў і 21 члена габінэту. Ураду засталося толькі падаць у адстаўку.

Учора на працягу дня Макданальд два разы наведаў караля і рэкамандаваў яму выклікаць Бальдвіна і Фэрбэрна Самуэля (які выконвае абавязкі лідэра лібэралаў з прычыны хваробы Лёйд-Джорджа). Кароль меў нараду з абодвума лідэрамі партыі. Якім-бы ня быў будучы ўрад, — «ён будзе ўрадам надзвычайнага часу», закліканым вывесьці краіну з фінансавага крызісу. (ТАСС).

З-пад фашысцкага ўціску—у краіну свабоднай працы

Пад градам куль азьвярэлых катаў польскія рабочыя прабуюць перайсьці на савецкую зямлю

За апошнія часы на мяжы БССР з Польшчай мае месца масавы пераход да нас з Польшчы перабежчыкаў. Так, за апошнія 10 дзён перайшло і затрымана пагранаховай ДПУ БССР звыш пяцьсот чалавек. ПЕРАХОДЗЯЦЬ ЦЕЛЫМІ ГРУПАМІ, ПА НЕКАЛЬКІ ДЗЕСЯТКАЎ ЧАЛАВЕК АДРАЗУ, прычым арганізавана і, часткова, са зброяй. Так, у ноч з 16 на 17 жніўня дзьвума групамі ў раёне Плешчаніц перашло 163 чалавекі, маючы ўпэрадзе сябе ўзброеных, з мэтаю прарвацца ў СССР сілай зброі, на выпадак сутычкі з польскай пагранаховай. 19 жніўня ў тым-жа раёне, трымя групамі пад агнём польскай пагранаховы перайшло да нас 147 ЧАЛ. Польская пагранахова працягвала абстрэльваць бягучых і на нашай тэрыторыі, прычым, кінутыя польскімі пагранічнікамі дзьве гранаты разарваліся на нашай тэрыторыі. Наглядаюцца перабежкі больш дробнымі групамі і ў радзе іншых раёнаў.

Перабежчыкі пераважна з асяродзьдзя рабочых, сялян - бедняко ў. Большая частка з іх складае моладзь, якая матывуе свой пераход крызісам, беспрацоўем у Польшчы і нежаданьнем служыць у польскай арміі.

ГАРОДНІНУ—ПРАЛЕТАРСКІМ ЦЭНТРАМ

ЗАГАТОВІЦЬ НА ЗІМУ

26 тысяч бочак гароднінны

Адкрыць 90 крам па продажы гароднай прадукцыі

—баявое заданьне МЦРК і Белкаапгароднінна

Пастанова бюро Менгаркому КП(б)Б

Заслухаўшы даклад тав. Зялічонка аб забесьпячэньні гор. Менску плодагароднінай, бюро Менгаркому КП(б)Б адзначае, што МЦРК і Белкаапгароднінна дагэтуль поўнасьцю ня выканалі дырэктывы бюро і сакратарыяту гаркому аб бесьперабойным забесьпячэньні гораду гароднінай.

Ня гледзячы на тое, што завоз гароднінны ў горад за апошні час значна павялічыўся (бульба, гуркі, капуста і інш.), рэалізацыя гароднінны дагэтуль пастаўлена зусім дрэнна. Гэта тлумачыцца невыкананьнем пастановы гаркому аб рэгэтарваньні сеткі крам (замест намечаных 90 крам дагэтуль адкрыта толькі 66), а таксама нездавальняючай пастаноўкай работы на складах МЦРК і Белкаапгароднінны (адсутнасьць арганізаванага транспарту для перавозкі гароднінны, факты адмаўленьня з боку гандлёвага магазынаў прымаць гароднінну і інш.).

Гарсавет дагэтуль не адвёў памяшканьняў для крам па продажы гароднінны, асабліва на акраінах гораду (Камароўка, Пярэспа, Серабранка і інш.) Белкаапгароднінна зусім павольна праводзіць будаўніцтва ларкоў і будынкаў пёгкага тыпу для продажу гароднінны.

Ня гледзячы на пастанову бюро і сакратарыяту гаркому аб своячасовай загатоўцы тары, асабліва для засолкі гуркоў, МЦРК і Белкаапгароднінна тарай не забясьпечаны, што пагражае зрывам за солкі гуркоў і квашаньня капусты. МЦРК і Белкаапгароднінна невыстарчальна скарысталі месячнік па збору тары, праведзены згодна пастанове гаркому.

Бюро Менгаркому прапануе:

1. Фракцыі гарсавету ВЫЗНАЧЫЦЬ ЦЬВЁРДУЮ СЕТКУ КРАМ НА АКРАІНАХ ГОРАДУ з такім разьлікам, каб было адкрыта ня менш чым па тры крамы на Камароўцы, Пярэспе, Серабрянцы, Кальварыйскай вуліцы, ня менш 5 крам у раёне Маскоўскай вуліцы і вагзалу. Абавязаць Белкаапгароднінну зараз-жа разгарнуць работу па пабудове ларкоў і будынкаў пёгкага тыпу на зімовы перыяд.

2. Абавязаць МЦРК, пэрсанальна тав. ТУРЭЦКАГА і Белкаапгароднінну пэрсанальна тав. ЗЯЛІЧОНКА, забясьпечыць засолку ня менш 15.000 бочак гуркоў, скончыўшы гэту работу не пазьней 1-га верасьня. Зараз-жа арганізаваць засолку ў некаторых сяўгасаў. Бюро Менгаркому папярэджвае МЦРК і Белкаапгароднінну, што дагэтуль падрыхтоўка да квашаньня капусты праводзілася зусім нездавальняюча, і прапануе зараз-жа разгарнуць гэту работу.

Бюро гаркому зварачае ўвагу ЗРК на зусім нездавальняючую работу іх па засолцы гуркоў, на дрэнную падрыхтоўку да забясьпячэньня рабочых плодагароднінай на зімовы перыяд. Бюро прапануе пад асабістую адказнасьць старшынь ЗРК зараз-жа прыступіць да гэтай работы.

Фракцыі Менгарсавету павінна даць дадатковыя заданьні па засолцы гуркоў аб'яднаньням Белкаапсаюзу, Белгандлю, райспажыўсаюзу і райканторы Белсадсаюзу, а таксама даць указаньні сяўгасам і калгасам аб засолцы гуркоў на месцах.

3. Бюро гаркому зварачае ўвагу фракцыі МЦРК на тое, што пабудова хаплёвых для гароднінны праходзіць зусім павольна, і прапануе разгарнуць работу больш шырокімі тэмпамі з такім разьлікам, каб уся работа па пабудове і рамонце была скончана на пазьней 1-га верасьня.

4. Абавязаць тав. Зялічонка і Турэцкага прыняць усе меры да ліквідацыі перабояў у адгрузцы бульбы і гароднінны. Адзначаючы недапушчальныя факты прастою вагонаў з неадгружанай гароднінай па 5-8 гадзін, устанавіць, як правіла, што прыбыўшыя вагоны з прадуктамі павінны быць разгружаны з максымальнай хуткасьцю.

5. Адзначаючы агідную пастаноўку работы транспарту, прапанаваць МЦРК і Белкаапгароднінне зараз-жа палепшыць работу па перавозцы гароднінны Белкаапгароднінне і МЦРК арганізаваць работу транспарту на працягу поўнага сутак.

6. Прапанаваць гаркому ЛКСМБ гарпрафсавету абвясьціць дзесяцідзённы паход па зборы тары.

Рэдакцыям газэт «Зьвязда» і «Рабочий» праз друк мабілізаваць увагу мясцовых дзесяцідзённіка збору тары.

Дэкаднік мабілізацыі тары

У мэтах поўнага забесьпячэньня рабочых гароднінай перад кааперацыйнымі арганізацыямі г. Менску паставлена зараз адказная задача максымальна разгарнуць загатоўкі і перапрацоўку гароднінны на зімовы час.



Адпраўка памідораў з калгасу ў горад

Спрыяючы ўраджай плодагароднінны дазваляе перавыканаць вызначаныя пляны загатовак, аднак, недахват тары, галоўным чынам бочак у кааперацыйных арганізацыях ставіць пагрозу выкананьне заданьня. Напрыклад, Менскі ЦРК павінен засалі 13.000 бочак гуркоў, 4.000 бочак памідораў, 2.000 бочак яблык, 4.000 бочак грыбоў і загатовіць 3.000 бочак павідла. Між тым МЦРК мае 15.000 бочак, не хапае каля 11.000.

Улічваючы неабходнасьць поўнасьцю выканаць пляны загатовак цераапрацоўкі гароднінны, гарпрафсавет, гарком камсамолу і праўленьне МЦРК пастанавілі правесьці 28-га жніўня дэкаду збору тары. Усе прадпрыемствы і ўстановы павінны здаць МЦРК усю вольную тару — бочкі і мяшкі і г. д. Гарпрафсавет, гарком камсамолу прапанавалі ўсім фабзаўкомам, мясцкомам і ячэйкам камсамолу разгарнуць шырокую растлумачальную работу вакол мабілізацыі тары.

45,5 проц.

бядняцка-серадняцкіх гаспадарак аб'яднаны ў калгасах

Паводле вестак Наркамзему, на 20 жніўня, у калгасах БССР **аб'яднана 351.253 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак**, што складае **45,5 проц.** усіх бядняцка - серадняцкіх гаспадарак рэспублікі.

26 раёнаў калектывізаваны звыш чым на 50 проц. Вось гэтыя раёны:

Койданаўскі — на 93 проц. **Лепельскі**—81,5 проц., **Клімавіцкі** — 85 процантаў, **Касьцюковіцкі** — 71,4, **Бягомльскі—70,8**, **Лёзьнянскі** — 68,9, **Мсьціслаўскі**—67,3, **Чэрыкаўскі** — 66,5, **Менскі**—65,7, **Сенненскі**—65,1, **Талочынскі**—64,1, **Віцебскі** — **61,9**, **Крычаўскі** — 61,3, **Аршанскі** — 58,1, **Каралінскі** — 57,6, **Полацкі** — 57,6, **Прапойскі** — 57,5, **Чашніцкі**—57,1, **Сіроцінскі** — 57,1, **Капыльскі** — 54,1, **Заслаўскі** — **52,8** **Вузьдзенскі** — 52,3, **Дрысенскі**—50,8, **Жыткавіцкі**—50,6, **Горацкі** — 50,1, **Вушацкі**—50,1 проц.

Тры раёны ўсё яшчэ цягнуцца ў тыле калектывізацыі. Вось гэтыя раёны:

Церахаўскі — 22,6 проц., **Бабруйскі** — 22,6 і **Пятрыкоўскі** — 23,6. процантаў.

„Чырвоная Зорка" — СОНЕЧНЫ ПАХОД. Звыш праграмы пов. амерык. камэдыя Чарлі Чэплін

„КУЛЬТУРА" Пач. у 7; 8-45; 10-30 — Новы пасьп. ня ўсходні фільм СЫН КРАІНЫ. Звыш праграмы. Часоп. БДК. № 15.

„Інтэрнацыянал" Пач. 1 с. у 7 ч. в. — МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ПАЎНОЧНАЕ КАХАНЬНЕ драма ў 7 частк. Звыш праграмы кіно-часоп. БДК № 14.

„Пралетары" Гарк. з 12 г. дня. — нашумеўш. фільм паводле раману ВОЙНІЧА ОВАД. У галоўн. ролі НАТА ВАЧНАДЗЭ

„Юны Піянэр" (будынак кіно „Культура") — С 22 жніўня САВУР МАГІЛА. Пачатак з 1 г. дня

„СПАРТАК" Пач. у 7, 9, 11. Касы—з 5 гадз. — КРЭСТ і МАУЗЭР. Драма ў 8 частках.

XI-ты ПЛЕНУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА САВЕТУ ПРАФСЮЗАЎ БЕЛ. адкрываецца СЁНЬНЯ, 25 жніўня, у 6 гадз. веч., у залі пасяджэньняў ЦСПС (Дом працы 2-гі паверх, пак. № 10)

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Аб выкананьні прамфінпляну бягучага году і аб лімітах на 1932 год (ВСНГБ, НКСнаб, сэктар вытворчасьці і плянаваньня).

2. Перабудова прафработы ў адпаведнасьці з рашэньнямі 5-га пленуму УсеЦСПС і вынікі месячніку самаправеркі (Арг. Інстр. Сэктар).

3. Аб перабудове спажывецкай кааперацыі і рабочым забесьпячэньні (БКС, Сац.-Быт. Сэктар).

Для здачы ВЕСТКІ у газэту „ЗЬВЯЗДА" званкі па тел. 7-81

ЗГУБЛЕН пашпарт на імя Рывавец Л. Г., выд. Мен. міліцыяй. Лічыць несапраўдным.

Дзьве даверанасьці, выданыя Белсельгаспромбанкам на імя т. Будніка Сяргея Васілёва, засьведчаныя Менскай Д-натарыяльнай канторай 14 сакавіка 1929 г. за № 17293 і 15 сакавіка 1931 г. за № 7612 лічыць з 15-VIII—31 г. несапраўднымі.

14 жніўня ЗГУБЛЕНА круглая каўчукавая Пятрыкоўскай суднабудаўнічай арцелі «Чырвоны Суднабудаўнік», якую лічыць несапраўднай.

Кошт публікацыі аб згубе 1 дакумэнту 1 р.

МЕН. ГК МОПР'у склікае на 25-е жніўня а 7 гадз. увечара нараду замежных рабочых і палітэмігрантаў, што працуюць у Менску. Нарада адбудзецца ў памяшканьні ЦК МОПР'у БССР (Савецкая 87, 2-гі паверх). З прычыны важнасьці пытаньняў, яўка абавязкова.

МЕН. ГК МОПР'у.

Жыткавіцкі рыбаводчы тэхнікум абвяшчае асенні набор у тэхнікум на 1-шы курс. Прымаюцца асобы з асьветай ня ніжэй 7-годкі. Прыём заяў да 15 верасьня з дакумэнтамі, вызначанымі ў даведніку НКА Бел. Пачатак заняткаў 1 кастрычніка. Студэнты поўнасьцю забясьпечваюцца інтэрнатам і ў пераважнай большасьці стыпэндыяй. Адрас: Жыткавічы, Зах. чыг., Рыбтэхнікум. Дырэкцыя

ГАРОЛЬД ЛЕЙД ШКАРКАСЬЦЬ і НАЦІСК у новай амэрыканскай камэдыі СКОРА!

Гомельскі Тэхнікум Грамадзкага Харчаваньня Белкаапсаюзу (Гомель, Пяцьчынская, № 4) абвяшчае асенні прыём студэнтаў—на першы асноўны курс у кольнасьці—80 асоб і на падрыхтоўчы курс—30 асоб. Тэхнікум рыхтуе спэцыялістаў сярэдняй кваліфікацыі ў галіне грамадзкага харчаваньня (гандлёва-эканамічнай, хімікаў-лябарантаў, тэхнікаў-тэхнолягаў і інш.), як для сэкцый трэсмарчу, так і для прадпрыемстваў (фабрычна-кухняў і буйных механізаваных сталовых). На асноўны курс прымаюцца асобы, якія скончылі сямігодні (ці мэнш) курс (поступ. ведм за 7-годку) ня ўзросьце 17—30 год. Для раскончыўшых сямігодні, або скончыўшых такі раней 1929 г. утвараюцца пры ньюя іспыты. На падрыхтоўчы курс прымаюцца асобы, якія маюць ведм за 5—6 групп. Прынятыя ў тэхнікум будуць забясьпечаны стыпэндыяй і інтэрнатам, як і ў іншых індустрыяльных тэхнікумах. Асобы, жадаючыя паступіць ў тэхнікум, павінны падаць заяву з дакумэнтамі (згодна правіл прыёму ў тэхнікумы) па адрасе: Гомель, Пяцьчынская вул. № 4, Тэхнікуму грамадзкага харчаваньня.

Заявы прымаюцца да 20-го верасьня 1931 г.

Сэктар кадраў Белкаапсаюзу.

Калектыў Дзяржпляну выказвае спачуваньне сям'і трагічна загінуўшага супрацоўніка Дзяржпляну Мікалая ЗЬМІТРОВІЧА.

Бюро партыйнай ячэйкі, МК і бюро калектыву камсамолу Дзяржпляну БССР з вялікім жалем паведамляюць аб нечаканай трагічнай сьмерці супрацоўніка Дзяржпляну БССР, —ударніка, актыўнага грамадзкага працаўніка, старшыні цэхпрафбюро БАМСу, чл. бюро калектыву ЛКСМ, чл. МК Дзяржпляну Мікалая ЗЬМІТРОВІЧА.

Бюро ІТР і калектыў ЛКСМБ Дзяржпляну АРГАНІЗУЮЦЬ СЫСТЭМАТЫЧНУЮ КАНСУЛЬТАЦЫЮ для плянава-апэрацыйных груп БССР. Кансультацыя пачнецца 29 жніўня 1931 г. ДЗЯЖУРСТВЫ будуць праводзіцца па чэтных лічбах ад 18 да 20 гадзін. Па ўсіх пытаньнях працы плянава-апэрацыйных груп, як у вусным, так і ў пісьмовай форме зварачацца ў Дзяржплян БССР—Менск, пляц Волі № 5, пакой № 6. Бюро ІТР і бюро калектыву ЛКСМ Дзяржпляну.

Даводзіцца да ведома ўсіх паступаючых ва Ўсебеларускую Саўпартшколу, што прыёмныя іспыты пачнуцца з 1-га кастрычніка 31 г. Усе таварышы, якія атрымалі паведамленьні аб допушчэньні да прыёмных іспытаў, павінны прыехаць у Саўпартшколу (Гомель, парк імя Луначарскага) 1-га кастрычніка